Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і МГК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

ЖНІВЕНЬ 20 1933 г. НЯДЗЕЛЯ № 183 (4727)

Год выданьня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

СЕНЬНЯ У НУМАРЫ

ПАСТАНОВА СНК САЮЗУ ССР І ЦК УсеКП(б) АБ ПАРАДКУ ЗАСЫПКІ ФОНДАЎ ДЛЯ ПАТРЭБ КАЛГАСАЎ.

ПАСТАНОВА ЦК КП(б)Б І СНК БССР аб фактах скажэньня дырэктыў партыі і ўраду ў авансаваньні калгасьнікаў збожжам.

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ — Сваячасова і высокаякасна правесьці ўборку, абмалот і збожжапастаўкі І. А. ЛЫЧОЎ—Вывесьці прамысловасьць на перадавыя пазыцыі. Р. СОСКІН — Бальшавікі Аршаншчыны ў барацьбе за ўборку і збожжапастаўкі.

КАРЭСПАНДЭНЦЫЯ: А. М.—Першыя крокі палітаддзелу.

ЗА МЯЖОЙ:

Японска-францускія спрэчкі за караловыя астравы.

Пабіцьцё штурмавікамі супрацоўніка гандлёвага прадстаўніцтва ў Бэрліне.

Лідэры II Інтэрнацыяналу адкрыта адмаўляюцца ад вучэньня К. Маркса.

ПЕРШЫ ДЗЕНЬ УСЕБЕЛАРУСКАЙ ПЕРАКЛІЧКІ

ВЫШЭЙ СЬЦЯГ СПАБОРНІЦТВА НА САЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ ПАЛЁХ

ПЕРАНЕСЬЦІ ВОПЫТ І ЛЕПШЫЯ ЎЗОРЫ ПРАЦЫ ПЕРАДАВЫХ У АДСТАЮЧЫЯ РАЁНЫ, СЕЛЬСАВЕТЫ, КАЛГАСЫ, БРЫГАДЫ

Сваячасова і высокаякасна правесьці ўборку, абмалот і збожжапастаўкі

Апублікаваная ўчора ў «Зьвязьдзе» вводка аб ходзе ўборкі азімых і яравых сьведчыць аб ганебнейшым адставаньні.

БССР адстала ад Заходняй вобласьці з якой мы спаборнічаем. Мы рэалізавалі толькі 90,7 проц. **уборачнага пляну азімых.**

Яшчэ больш рэзкае адставаньне ад Заходняй вобласьці ў тэмпах уборкі **яравых.** На 15 жніўня яравы клін убран толькі на 17,4 проц.

Або вось даныя аб цераблёным ільну па рэспубліцы. На 15 жніўня выцерабілена толькі 12,5 проц. пляну. Найвялікшай ганьбай зьяўляюцца такія марудныя тэмпы ільнаўборкі!

Дзе прычыны?

Прычыны — у самацёчных, дэмабілізацыйных настроях, у няўменьні арганізаваць работу, у няўменьні пабальшавіцку змагацца за аккуратнае дырэктыў партыі і ўраду аб уборцы, абмалоце і цьвёрдых пастаўках.

Паглядзеце на выкананьне ўборачнага пляну ў раённым разрэзе. Якая жалкая розьніца! Раёны аднэй і тэйжа зоны з аднымі і тымі-ж умовамі і магчымасьцямі правядзяць уборку **РОЗНЫМІ** тэмпамі і з **РОЗНАЙ** якасьцю.

ПАЎДНЁВАЯ ЗОНА. Церахаўскі раён убраў азімых на 100 проц., яравых на 28,4 проц.; Жлобінскі раён, адпаведна, 100 проц. і 33,7 проц., Жыткавіцкі— 100 проц. і 31,6 проц., Брагінскі — 100 проц. і 40,2 проц.

І ў той-жа час: Нараўлянскі раён убраў азімых толькі 76,8 проц., яравых—14 проц., Ельскі раён, адпаведна, 85,5 проц. і 16,2 проц., Тураўскі — 90,5 проц. і 22,4 проц. і г. д.

ЦЭНТРАЛЬНАЯ ЗОНА: Барысаўскі раён—100 проц. па азімых, 36,5 па яравых. Крычаўскі — 100 проц. і 24,6 проц., Пухавіцкі—98,1 проц. і 27,9 проц.

І ў той-жа час: Плешчаніцкі раён —83,5 проц. па азімых і 9,3 проц. па яравых. Заслаўскі—83 проц. і 9.5 проц., Лагойскі—85,5 проц., і 6,2 проц., Мсьціслаўскі — 85,7 проц. і 6,9 проц.

Гэтыя супастаўленьні—яркі доказ таго, што там, дзе ўмеюць працаваць па-бальшавіцку, дзе паўхільна ажыцьцяўляюцца ўказаньні ЦК і СНК—уборка праходзіць па-ўдарнаму. Там-жа дзе гэтага няма, уборка недапушчальна адстае.

Саўгасы БССР убралі азімых клін на 78 проц., яравых—на 6,2 проц. Гадавы план збожжаздачы саўгасамі выкананы на 7,5 проц.

Такі ход уборкі і збожжаздачы ў саўгасах нельга ні ў якім разе лічыць здавальняючым. У адносінах да саўгасаў партыя і ўрад маюць права ставіць павышаныя патрабаваньні, як да дзяржаўных прадпрыемстваў, якія павінны паказваць лепшыя ўзоры ў правядзеньні сельгаспрадпрыемстваў.

Партарганізацыі саўгасаў і саўгасных трустаў абавязаны на аснове бязьлітаснай барацьбы з усякімі буржуазнымі, антыдзяржаўнымі тэндэнцыямі, на аснове шырокага разгортваньня сацыялістычных мэтадаў пра—сацспаборніцтва і ўдарніцтва на уборцы і малацьбе, забясьпечыць сваячасовае і высокаякаснае правядзеньне уборкі і поўнае выкананьне вызначанага пастановай СНК СССР і ЦК УсеКП(б) канчатковага пляну збожжаздачы.

400.000 пудоў збожжа—і ні грама менш!—такі канчатковы план збожжаздачы для саўгасаў БССР, устаноўлены ўрадам і ЦК партыі. За выкананьне гэтага пляну саўгасы павінны змагацца з усёй сілай і энэргіяй. Гэты план павінен быць выкананы безагаворачна.

Апроч таго, дырэктары саўгасаў і трустаў павінны ні на хвіліну не забываць, што «звыш пляну збожжаздачы яны абавязаны вярнуць патрай атрыманыя ад дзяржавы збожжавыя пазыкі, і што за поўны іх зварот яны адказваюць, як і за выкананьне гэтага пляну збожжаздачы».
(З пост. СНК СССР і ЦК УсеКП(б).

Адстаючым вучасткам і ва ўборцы і ў збожжаздачы зьяўляецца адпаасобны сэктар. Партыя ня раз папярэджвала ўсе партыйныя і савецкія арганізацыі супроць недаацэнкі адпаасобніка, супроць ігнараваньня работы па арганізацыі ўборкі, абмалоту і збожжапаставак адпаасобным сэктарам.

І ўсё-ж ва многіх раёнах адпаасобнік выпаў з поля зроку партыйных і савецкіх арганізацый (**ЛОЕЎ, ВІЦЕБСК** і інш). Уборка, абмалот і цьвёрдыя пастаўкі ў радзе месц праходзяць самацёкам і, эрагучела, аб самотна нездавольняюча.

Адставаньне адпаасобніка павінна быць ліквідавана ў бліжэйшы-ж час. Трэба арганізаваць работу ў адпаасобным сэктары так, каб кожны працоўны адпаасобнік—заўтрашні калгасьнік мабілізаваўся на сваячасовае і добрае правядзеньне ўборкі ўраджаю і на першачарговае выкананьне абавязкаў перад дзяржавай.

Зусім недапушчальным зьяўляецца становішча збожжаздачы кулацка-заможнымі гаспадаркамі. На 15 жніўня кулацка-заможная частка здала збожжа толькі 1,7 проц. гадавога пляну. Гэта ліча—сьведчыць аб слабага націску на кулацка-заможныя элементы, сьведчыць ліберальных адносін да кулака з боку многіх раённых арганізацый і сельсаветаў. З гакім становішчам трэба рашуча і зараз-жа пакончыць.

Наперакор дырэктывам партыі і ўраду аб арганізацыі непарыўнага канвэеру—бесьперабойнага паступленьня збожжа адразу пасьля сушкі на малатарню і ад малатарні — да прыёмачнага пункту, у радзе месц да пускаюцца вялізарныя недапушчальныя разьбежкі паміж уборкай і абмалотам, паміж абмалотам і збожжаздачай.

Вось для прыкладу Глускі раён, дзе ўборка азімых на 15 жніўня скончана поўнасьцю. А колькі-ж абмалочана? Толькі 3,5 проц.

Па Асіпавіцкім раёне азімыя ўбраны на 99,5 проц., а абмалочаны на 7,7 проц. Па Вушацкім раёне ўборка азімых скончана, а абмалочана толькі... 1,3 проц. і г. д.

Такая разьбежка на руку толькі клясаваму ворагу, бо яна азначае, што ежатае збожжа або застаецца ў снопах на полі і гніе, або асядае ў сьвірнах і разбазарваецца.

Адным з новых маневраў кулака зьяўляюцца спробы ўдарыць па якасьці калгаснага ўраджаю, зьнізіць яго разьмеры шляхам арганізацыі страт, няправільнага абмалоту, здачы дзяржаве нягодзнай, нядобракаснай прадукцыі.

І трэба проста сказаць, што ў радзе месц пасобныя калгасы, сельсаветы, раённыя арганізацыі замест таго, каб ня толькі сваячасова, але і добра ўбраць кожны засеяны гэктар, ганяюцца за «рэкордамі», за голай лічбай, захапляюцца «лявацкай» гульнёй у сустрочныя тэрміны. Адсюль факты шкодніцкай пагоні за голымі лічбамі, абсалютнага ігнараваньня якасьці ўборкі, абмалоту і збожжаздачы, аб якіх сьцвярджала «Праўда».

Завяршыць недадпушчальна ўборку збожжавых і сваячасова правесьці ст. пастаўкі, забясьпечыўшы высокую, найлепшую якасьць—вось абавязак усіх партыйных і савецкіх арганізацый, усіх калгасаў, сельсаветаў, саўгасаў, МТС і раёнаў БССР.

На аснове шырокага разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва ў калгасах, сельсаветах і раёнах даб'ёмся пяршынства ў сацспаборніцтве з Заходняй вобласьцю, завяжем гаварое месца на ўсесаюзнай чырвонай дошцы.

ЗА ГАНАРОВАЕ МЕСЦА НА ЧЫРВОНАЙ ДОШЦЫ

Сёньня пачынаецца ўсебеларуская пераклічка раёнаў, сельсаветаў, калгасаў, МТС, калгасных брыгад. Пераклічка прысьвечана разгортваньню сацыялістычнага спаборніцтва раёнаў, сельсаветаў, калгасаў, брыгад, праверцы таго, як ідзе сацспаборніцтва БССР з Заходняй вобласьцю на лепшую ўборку і здачу прадукцыі дзяржаве.

Раёны, сельсаветы, калгасы, брыгады па пераклічцы раскажуць як ідзе ў іх барацьба за высокі ўраджай, як яны выконваюць свае абавязацельствы перад дзяржавай, як ударнікі сацыялістычных палёў змагаюцца за гаварое месца на ўсесаюзнай чырвонай дошцы, за занясьньне ў чырвоны рэспубліканскі сьпіс. Вось асноўная «абвестка дня» ўсебеларускай пераклічкі.

2-гі ўсебеларускі зьезд калгасьнікаў выклікаў Заходнюю вобласьць, з якой мы спаборнічалі вясной, на барацьбу за бальшавіцкія калгасы, за заможнага калгасьніка.

«Сацспаборніцтва з Заходняй вобласьцю,—адзначыў зьезд,—у часе веснавой сяўбы падбадзёрвала і падштурхоўвала нас. Яно зьявіцца магутным стымулам далейшай нашай барацьбы за ўраджай, нашай перамогі».

«Ад нас саміх,—падкрэсьліў зьезд,—ад таго, як мы будзем змагацца за сумленную працу па ўборцы, за першачарговую здачу прадукцыі дзяржаве залежыць зрабіць гэты год апошнім годам труднасьцяй, для гэтага варта пра цаваць, не шкадуючы сіл».

Зараз, калі пачалася ўборка ўраджаю і пастаўка збожжа, калі наступіў рашаючы пэрыяд с.-г. работ, сацыялістычнае спаборніцтва на вёсцы становіцца прысьвечана разгортваньню сацыялістычнага спаборніцтва раёнаў, сельсаветаў, калгасаў, брыгад, праверцы таго, як ідзе сацспаборніцтва БССР з Заходняй вобласьцю на лепшую ўборку і здачу прадукцыі дзяржаве.

Раёны, сельсаветы, калгасы, брыгады па пераклічцы раскажуць як ідзе ў іх барацьба за высокі ўраджай, як яны выконваюць свае абавязацельствы перад дзяржавай, як ударнікі сацыялістычных палёў змагаюцца за гаварое месца на ўсесаюзнай чырвонай дошцы, за занясьньне ў чырвоны рэспубліканскі сьпіс. Вось асноўная «абвестка дня» ўсебеларускай пераклічкі.

2-гі ўсебеларускі зьезд калгасьнікаў выклікаў Заходнюю вобласьць, з якой мы спаборнічалі вясной, на барацьбу за бальшавіцкія калгасы, за заможнага калгасьніка.

«Сацспаборніцтва з Заходняй вобласьцю,—адзначыў зьезд,—у часе веснавой сяўбы падбадзёрвала і падштурхоўвала нас. Яно зьявіцца магутным стымулам далейшай нашай барацьбы за ўраджай, нашай перамогі».

«Ад нас саміх,—падкрэсьліў зьезд,—ад таго, як мы будзем змагацца за сумленную працу па ўборцы, за першачарговую здачу прадукцыі дзяржаве залежыць зрабіць гэты год апошнім годам труднасьцяй, для гэтага варта пра цаваць, не шкадуючы сіл».

Зараз, калі пачалася ўборка ўраджаю і пастаўка збожжа, калі наступіў рашаючы пэрыяд с.-г. работ, сацыялістычнае спаборніцтва на вёсцы становіцца справай гонару, адвагі, гэроўства мільёнаў калгасьнікаў. У рэзультаце сацыялістычнага спаборніцтва высока ўзьняўся вытворчы энтузіязм калгасных мас. Множацца рады ўдарнікаў бальшавіцкага ўраджаю. Лепшыя людзі калгаснай вёскі лапаўняюць калёны барацьбітоў за сваячасовую ўборку, за захаваньне кожнага зерня, за поўнае і датэрміновае выкананьне абавязацельстваў перад дзяржавай, актыўных змагароў супроць шкоднікаў, подыра, супроць клясавага ворага.

Узначаліць гэты вялікі ўздым, згуртаваць магутны калгасны актыў—гаварое задача, ускладзеная на мясцовыя партыйныя і савецкія арганізацыі, на палітаддзелы МТС і саўгасаў.

Рашаючае зьвяно—БАЛЬШАВІЦКІЯ ТЭМПЫ ПАМНОЖЫЦЬ НА ЯКАСЬЦЬ. Змагаючыся за высокія тэмпы ўборкі малацьбы і пастаўкі прадукцыі дзяржаве, мы ні ў якім разе не павінны забываць аб якасьці і арганізаванасьці нашай працы. Не пакінуць у полі ні аднаго коласа, сваячасова прасушыць збожжа, не дапусьціць страт пры абмалоце, здаваць дзяржаве высокаякасную прадукцыю, забясьпечыць як мага лепшую апрацоўку ільну,—такія патрабаваньні прад'яўлены да кожнага ўдарніка бальшавіцкага ўраджаю.

Пагоня за рэкордамі, за рапартамі на шкоду якасьці—злачынства перад дзяржавай. Той хто ўбірае нясьпелае зялёнае жыта, хто здае на пункт вільготнае, засьмечанае збожжа, хто плюе на якасьць апрацоўкі ільну—той фактычна дапамагае клясаваму ворагу. Аб гэтым трэба цьвёрда памятаць.

Самая бязьлітасная вайна павінна быць абвешчана голай дэклярацыйнасьці і «лявацкім» захапленьням процантамі.

УСЕБЕЛАРУСКАЯ ПЕРАКЛІЧКА МАЕ СВАЁЙ МЭТАЙ АБМЯНЯЦЦА ВОПЫТАМ УДАРНАЙ РАБОТЫ НА САЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ ПАЛЁХ.

Абмен вопытам — неадлучная частка сацыялістычнага спаборніцтва. Ён падцягвае адсталых, ён дапамагае ім усвоіць лепшыя ўзоры работы і даганяць перадавікоў.

«АДНЫ ПРАЦУЮЦЬ ДРЭННА, ДРУГІЯ ДОБРА, ТРЭЦІЯ ЛЕПШ,—ДАГАНЯЙ ЛЕПШЫХ І ДАБЕЙСЯ АГУЛЬНАГА ЎЗДЫМУ» (СТАЛІН).

На старонках «Зьвязды» лепшыя раёны, сельсаветы, калгасы падзеляцца вопытам сваёй работы, пакажуць, якім шляхам, якімі мэтадамі яны заваявалі перамогу, што трэба зрабіць, каб дасягнуць посьпехаў у барацьбе за бальшавіцкі ўраджай.

Абвяшчаем усебеларускую пераклічку адкрытай.

Ударнай, самаадданай, сумленнай працай даб'ёмся пяршынства ў сацспаборніцтве! Заваюем гаварое месца на чырвонай дошцы. Вышэй узьнімем сьцяг сацыялістычнага спаборніцтва!

АБ ПАРАДКУ ЗАСЫПКІ ФОНДАЎ ДЛЯ ПАТРЭБ КАЛГАСАЎ

ПАСТАНОВА СНК САЮЗУ ССР І ЦК УсеКП(б)

У сувязі з запытаньнямі паасобных калгасаў і калгасьнікаў, СНК Саюзу ССР і ЦК УсеКП(б) растлумачваюць:

Пастановай СНК Саюзу ССР і ЦК УсеКП(б) ад 2-VIII—33 г. «Аб парадку засыпкі фондаў для патрэб калгасаў і разьмеркаваньні збожжа паміж калгасьнікамі па працаднёх», забаронены савецкім і партыйным арганізацыям сваімі распараджаньнямі ствараць у калгасах дадатковыя фонды і тым самым зьменшаць колькасьць збожжа, належачага разьмеркаваньню паміж калгасьнікамі па працаднёх. Гэтай пастановай забясьпечваецца права саміх калгасьнікаў, свабодна распараджацца астачамі збожжа ў калгасах пасьля выкананьня калгасамі сваіх абавязкаў перад дзяржавай і пасьля засыпкі абавязковых фондаў насеньных, страхавых і фуражных.

Пацьвярджаючы да паўхільнага выкананьня забарону савецкім і партыйным арганізацыям ствараць зьверху іншыя фонды акрамя ўказаных у пастанове СНК СССР і ЦК УсеКП(б), ад 2-VIII—33 г. (насеньных, страхавых і фуражных) СНК Саюзу ССР і ЦК УсеКП(б) растлумачваюць, што, калі самі калгасы пажадаюць, яны маюць права пастановай агульнага сходу калгасу, з удзелам ня менш двух трэцяй калгасьнікаў, ствараць і іншыя фонды ў калгасах, як-та: фонд на паляпшэньне нявялікіх капіталаў у калгасах, а таксама фонд для аказаньня дапамогі інвалідам, сем'ям чырвонаармейцаў, на ўтрыманьне дзіцячых ясьлей.

• Старшыня СНК Саюзу ССР
В. МОЛАТАЎ (СКРАБІН).
Сакратар ЦК УсеКП(б)
І. СТАЛІН.

ПРА ФАКТЫ СКАЖЭНЬНЯ ДЫРЭКТЫЎ ПАРТЫІ І УРАДУ АБ АВАНСАВАНЬНІ КАЛГАСЬНІКАЎ ЗБОЖЖАМ

ПАСТАНОВА ЦК КП(б)Б І СНК БССР

ЦК КП(б)Б і СНК канстатуе, што ў радзе калгасаў ужо з самага пачатку малацьбы дапушчаны скажэньні дырэктыў партыі і ўраду аб авансаваньні калгасьнікаў. Гэтыя скажэньні заключаюцца ў тым, што ў радзе месц з першага абмалоту, ня здаўшы нічога дзяржаве, збожжа раздана калгасьнікам снапамі (Сіроцінскі раён і інш.), авансы выдаюцца ў разьмерах, перавышаючых устаноўленыя процанты, і разьмяркоўваюцца па еданках, дварох і па кулацкай ураўнілаўцы, бяз уліку працадзён (Веткаўскі, Бабруйскі, Петрыкаўскі, Рэчыцкі, Магілеўскі і Клімавіцкі раёны).

Гэтыя факты сьведчаць аб няўпасьці ў радзе калгасаў антыдзяржаўных тэндэнцый і праяў кулацкага сабатажу збожжазагатовак.

У радзе раёнаў райкомы КП(б)Б не рэагуюць на гэтыя правы антыдзяржаўных тэндэнцый і кулацкіх вылазак, а таксама на патураньне з боку асобных членаў партыі такім зьявішчам (Сіроцінскі, Хойніцкі, Веткаўскі раёны).

Слуцкі райком і райвыканком дапусьцілі ў сваіх рашэньнях няправільныя і блытаныя ўказаньні аб парадку авансаваньня калгасьнікаў і разьмеркаваньня ўраджаю, прапануючы калгасам авансаваць выключна добрасумленна працуючых калгасьнікаў, замест авансаваньня добрасумленных калгасьнікаў-ударнікаў у першую чаргу, як гэта ўказана ў пастанове ЦК і СНК.

ЦК КП(б)Б і СНК пастанаўляюць:

1. Прапанаваць Наркамазему зрабіць праверку выдачы авансаў у Ельскім, Веткаўскім і Рэчыцкім раёнах. Работу правесьці на працягу аднэй пяцідзёнкі. Матар'ял праверкі далажыць ЦК.

2. Прапанаваць Слуцкаму РК КП(б)Б перагледзіць сваё рашэньне ад 24-VII 1933 г. «Аб ходзе ўборкі сенажаці, падрыстоўцы да ўборкі збожжавых у калгасе «Гігант» і пастанову бюро РК і прэзыдыуму РВК «Аб парадку выдачы авансаў збожжа ў калгасах» і выправіць іх у адпаведнасьці з пастановай ЦК КП(б)Б і СНК БССР.

3. Абавязаць РК КП(б)Б Ельскага, Сіроцінскага, Веткаўскага, Петрыкаўскага, Рэчыцкага, Магілеўскага, Клімавіцкага раёнаў праверыць у калгасах дапушчаныя скажэньні ў выдачы авансаў па кулацкаму прынцыпу і вінаватых прыцягнуць да суровай адказнасьці.

Абавязаць усе райкомы і райвыканкомы неадкладна праверыць практыку авансаваньня ў калгасах з тым, каб неадкладна-ж выправіць магчымыя скажэньні ў гэтай справе. Аб выніках праверкі далажыць ЦК і СНК.

4. ЦК КП(б)Б і СНК БССР абавязваюць усе партыйныя і савецкія арганізацыі разгарнуць самую рашучую барацьбу з кулацкімі спробамі сарваць выкананьне асобнымі калгасамі сваіх абавязкаў перад дзяржавай па збожжапастаўках. Партыйныя і савецкія арганізацыі павінны рашуча і неадкладна выправіць дапушчаныя скажэньні ў галіне авансаваньня калгасьнікаў, мабілізуючы іх увагу на першачарговае выкананьне абавязкаў перад дзяржавай, што зьяўляецца магутным сродкам сацыялістычнага перавыхаваньня калгасьнікаў, а значыць і ўмацаваньня калгасаў.

Л. ПЛОТКІН

Нач. палітаддзелу Ветрынскай МТС

Лён убярэм бяз страт

Перабудаваць партработу ў калгасах, перанесьці яе ў брыгаду, зьвяно —вось што мы паставілі сваёй баявой задачай.

Што зроблена?

Арганізаваны 3 вытворчыя калгасныя ячэйкі, 2 кацыдацкія групы, 13 партыйна-камсамольскіх ядраў і 30 вытворчых камсамольскіх ячэек у калгасах МТС. Ва ўсіх іншых калгасах сумесна з райкомам партыі вылучаны паргарганізатары.

Ахоп усіх калгасаў партыйным уплывам, стварэньне моцнага калгаснага актыву ўжо дало свае вынікі. У спаборніцтве з Полацкай МТС на лепшую ўборку азімых пяршынства засталося за намі.

Палітаддзел арганізаваў масавае сацыялістычнае спаборніцтва ў калгасах. У рэзультаце плян па ўборцы азімых поўнасьцю выкананы—убрана 4.058 гэктараў. Жнівеньскі пляц збожжаздачы выкананы на 193,6 проц. Разгортваем уборку аўса.

Паасобныя калгасы ў пагоні за «рэкордамі» прабавалі скаць нясьпелы ўраджай. Гэта шкодная тэндэнцыя атрымала з боку палітаддзелу рашучы адпор.

На ўборцы ільну максымальна скарыстоўвалі ільнацерабілкі «камсамолка». Усе 33 спраўныя церабілкі пушчаны ў ход. У рэзультаце рашучай барацьбы з антымэханізатарскімі тэндэнцыямі, якія яшчэ цалкам не зжыты, мы дабіліся выпрацоўкі на адну церабілку ў сярэднім па 2 га за дзень. Горш з машынамі Гільштэйна. З 21 машыны працуе толькі 10. Няма кэнтр-прывадоў, шківаў і валоў.

На 18 жніўня ўсяго выцерабілена 820 гэктараў ільну, або 34 проц. пляну. Ужо разаслана 130 з паловай гэктараў. Калгас «Кастрычнік» першым здаў дзяржаве 195 кгр. ільнянога сеня (старшыня тав. Гофман). Калгас імя Варапцылава скончыў ужо мочку свыпраньнага ільну і прыступіў да апрацоўкі трасты, з тым, каб сваячасова здаць валакно дзяржаве.

Пачынаем сяўбу азімых 20 жніўня. Ужо заарана 2.721 га папару, або 120 проц. пляну. Вывезена гною 29.227 тон, замест пляну ў 9 тыс. тон. Таксама разгарнулі зяблевае ворыва і лушчэньне. Плян уздыму цалінны выкананы на 70 проц.

Па прыкладу Паўночна-каўказкага палітсэктару, ва ўсіх калгасах арганізаваны атрады «лёгкай кавалерыі» з калгаснай моладзі. Зараз мы пераключаем атрады «лёгкай кавалерыі», усю калгасную грамадзкасьць і камсамол на барацьбу са стратамі пры ўборцы ільну. У радзе калгасаў пасьля ручнога і мэханічнага цераблёньня застаецца частка дробнага ільну, які мае ў галоўках шмат ільнянога сеня. Арганізуем падвойнае цераблёньне.

Мы даем слова не пакінуць на ільняных палёх ні аднаго ільнянога сеня і выклікаем Полацкую МТС і ўсе іншыя ільнаводчыя МТС праверыць якасьць уборкі ільну ў калгасах і разгарнуць барацьбу са стратамі.

ЧЫРВОНАПОЛЬСКІ СЕЛЬСАВЕТ, МАГІЛЕЎШЧЫНА

Беражэм кожны колас

Наш **ЧЫРВОНАПОЛЬСКІ** сельсавет, Магілеўскага раёну, скончыў сяўбу першым у раёне. Калгасная зямля заплацілася высокім ураджаем. Са многіх вучасткаў мы зьбіраем па 16-20 цэнтнэраў жыта і ячменю з гэктара.

УБРАЦЬ ПАСЕВЫ СВАЯЧАСОВА, НЯ СТРАЦІЎШЫ НІ АДНАГО КАЛАСКА, АБМАЛАЦІЦЬ СУХОЕ ЗБОЖЖА, З-ПАД МАЛАТАРНІ ЗДАЦЬ ДЗЯРЖАВЕ НАЙЛЕПШАЕ ЗБОЖЖА, што належыць з нас па абавязацельствах, і **СВАЯЧАСОВА РАЗЬЛІЧЫЦЦА З МТС** —такую задачу, як першую запавядзь, паставілі мы перад сабой.

Уборка жыта скончана 10 жніўня. Мы не дапусьцілі ні шкоднай пасьпешнасьці, ні перасьпяваньня на ніве.

Ну, ажалі мы ўраджай азімых і раньняга ячменю з посьпехам, а 13 жніўня нашоў моцны дождж. Ня зьвезьлі з поля часткі збожжа, бо было яно сыраватае. Два дні ліў дождж, а 15 жніўня распагодзілася. Што мы робім? Мы кожны колас падстаўляем сонцу і ветру. **РАНІЦОЙ ЗДЫМАЕМ З БАБАК ШАПКІ, АДКРЫВАЕМ КАЛАСЫ, А НА НАЧ ЗНОЎ ЗАКРЫВАЕМ.**

Пару дзён падсохне так збожжына на полі—і гатова. А тут зноў надвор'е хмурыцца. Няўжо-ж здавацца перад дажджом? НЕ. Мы па ініцыятыве палітаддзелу рашылі—вазіць сухое збожжа з поля ноччу. Раніцой зноў дождж, а жыта ў нас зьвезена!

Крыху вернемся назад, скажам, як мы навучыліся бераглы кожны колас. Пасьля жніва пушчаем граблі конныя зграбаць каласкі, а пасьля грабілкі ходзяць па іржышчы дзеці і старыя з кашолаткамі, зьбіраюць каласкі, што засталіся ад падвойнага зграбаньня конными граблямі.

Нямала так сабралі, лічы, пудоў па 2-3 з гэктара.

НУ І ПРЫ ВОЗЦЫ З ПОЛЯ БЕРАЖЭМ КОЖНАЕ ЗЕРНЯ: фурманкі абітыя або фагожай, або подсьцілкамі засьцілаюцца.

У ЧАС УБОРКІ Ў НАС УСЕ НА ПОЛІ, АД МАЛОГА ДА СТАРОГА. Раней толькі абеды калектыўныя варылі, а зараз варацца вячэры і сьнеданьні і проста да месца працы прывозяцца.

Ясьлі працуюць круглыя суткі.

Скажам зараз аб малацьбе. Пакуль жыта было сыраватае, мы яго падсушвалі ў еўнях, малацілі на конных малатарнях і, не чакаючы, пакуль набярэцца гара збожжа, здавалі дзяржаве проста з-пад малатарні. Зараз ва ўсю гудуць трактарныя эмтээсаўскія малатарні ў калгасах імя Леніна і «Шлях сацыялізму», а ў «Камінтэрне» малатарню варочае—дый як лоўка!—электрычная сіла, што прыйшла і да нас з Белдрэсу. Вось да чаго дажылі мы.

Толькі два калгасы ў сельсавеце, як драбнейшыя, працуюць на конных малатарнях.

МАЛАТАРНІ НАШЫ ПРАЦУЮЦЬ КРУГЛЫЯ СУТКІ. Пры кожнай малатарні—упаўнаважаны палітаддзелу, вагаўшчык і г. д.

Праўда, кулацкае ахвосьце, гультаі ў калгасе імя Леніна—браты Савіцкія напрабавалі ўкрасьці 30 снапоў, але злавілі іх, зараз-жа мітынг наладзілі, па полі-ж іх, зладзеяў, зьнялі з працы, выключылі з калгасу і пад суд аддалі.

З-ПАД МАШЫН ЗБОЖЖА ЗДАЕМ ДЗЯРЖАВЕ. Па жыту і ячменю мы ўжо **ВЫКАНАЛІ ГАДАВЫ ПЛЯН ПОЎНАСЬЦЮ,** гэтымі днямі здамо і па іншых яравых: як толькі сажнем, высушым, змалоцім—так і здамо. Зараз разьлічваемся з МТС, здаем натурплату за яе работу.

І яшчэ трэба падкрэсьліць вельмі важны факт. Расьце вага калгаснага працадня. Узяць калгас імя Молатава: тут збожжавых падае **НА 1 ПРАЦАДЗЕНЬ 5,5 КГР.** Некаторыя дзядзькі атрымаюць паўтараста-дзьвесьце пудоў збожжа. Гэта цэлая клець. А поўная клець, нават паловы, ніколі ня меў наш калгасьнік, калі быў аднаасобнікам.

І вось яшчэ прыклад. У калгасе імя Леніна падлічылі, што на **1 ПРАЦАДЗЕНЬ ВЫПАДАЕ 6 КГР. ЗБОЖЖАВЫХ.** Ударнік Арлоўскі Мікола атрымае 155 пудоў збожжа, Арлоўскі Адам —120 пудоў, Ларчанка Ігнат—130 пудоў і г. д. А гультай Скачкоў Паўла атрымае ў дзесяць разоў менш.

Мы ўжо становімся заможнымі. А каб на лета атрымаць яшчэ лепшы ўраджай, ужо ўзьнімаем зяблева.

Запэўняем партыю і ўрад, што мы, чырвонапольцы, будзем яшчэ мацней змагацца, каб заваяваць пяршынства ў спаборніцтве.

Ад імя калгасаў сельсавету:
Старшыня сельсавету **КУШЛЯНКОЎ.**

ХОЙНІКІ

Райком партыі і палітаддзел арганізавалі пільны кантроль над якасьцю збожжапаставак. На прыёмачным пункты ідзе збожжа першага гатунку. Факты дастаўкі сырога збожжа—выключаньне, прычым гэтае збожжа ня было прынята.

На аснове масавай работы сярод калгасаў і аднаасобнікаў, дасягнут эрух у разгортваньні збожжапаставак. На 18 жніўня калгасы МТС выканалі гадавы плян збожжапаставак на 34 проц., а іншыя калгасы — на 45. Па аднаасобных гаспадарках гадавы плян па цьвёрдых збожжапастаўках выкананы на 24,3 проц.

Калгас **«КАМУНАР»** першым у раёне выканаў гадавы плян па збожжапастаўках і разьлічыўся з МТС.

ДЗЯНІСКЕВІЧ.

ШКЛОЎ

Камуна «Іскра» поўнасьцю разьлічылася з дзяржавай па азімых і яравых. Па абавязацельствах здана 1.863 кгр. жыта і 1.019 кгр. ячменю.

ПАЛІТАДДЗЕЛ МТС.

БАБРУЙСК

Пад непасрэдным кіраўніцтвам ЦК КП(б)В, на чале з т. **ГІКАЛО,** Бабруйскі раён датэрмінова выканаў жнівеньскі плян па цьвёрдых збожжапастаўках. На 17 жніўня здана 1.300 тон, замест устаноўленых месячным зданьнем 1.200 тон.

РК, РВК, ПАЛІТАДДЗЕЛ.

ЦК КП(б)Б, СНК БССР, „ЗЬВЯЗЬДЗЕ"

РАПАРТ

Дрысенскі раён да 18 жніўня поўнасьцю ўбраў сена і выканаў плян сенажаготовак на 105 проц.

Жыта таксама поўнасьцю ўбрана. 15 калгасаў выканалі гадавы пляны па пастаўках азімых. Усяго паступіла 230 тон жыта.

Разгортваецца масавая ўборка ільну. Плян церабленьня выканан на 36 проц. Дзяржаве зданы першыя 240 цэнтнэраў ільнатрасты.

РК КП(б)Б БУРАЧЭЎСКІ.
РВК АНТОНАЎ.

І тэмпы і якасьць

Наш калгас імя **СТАЛІНА** да арганізацыі калгаснай вытворчай партыячэйкі ўвесь час адставаў.

Цяпер — іншая справа. У нас арганізавана вытворчая партыйная ячэйка і яна пры штодзённым кіраўніцтве і дапамозе палітаддзелу вывела калгас у перадавыя ў сельсавеце.

Выступаючы на ўсебеларускай пераклічцы перадаю вопыт нашай работы.

Перш за ўсё мы ўмацавалі партыйцамі і камсамольцамі нашы брыгады і зьвенні. Сюды перакінулі 5 камуністаў і 9 камсамольцаў. Камуністы арганізавалі ў брыгадах спаборніцтва.

Што вечар кожная брыгада, зьвяно, паасобны калгасьнік, калгасьніца ведаюць, як яны працавалі за дзень і хто сёньня ідзе наперадзе, хто адстае.

Разультаты спаборніцтва асьвятляюцца ў штодзённых брыгадных штурмоўках.

Адсюль і вынікі: значная частка калгасьніц на жніве і ільнацераблёньні выконвае нормы на 130-140 проц.

Масавую работу мы праводзім непасрэдна на полі, для чаго скарыстоўваем кожную вольную хвіліну — абедзены перапынак, перад выхадам на работу і вечарам. У кожнай брыгадзе вылучаны чытчык газэт і групавы агітатар. За апошнія 20 дзён праведзена 8 радыёнарад па пытаньнях уборкі і збожжапаставак.

Мы падлічылі, колькі, прыкладна, узважа працадзень у калгасе. Аказалася, што пасьля выкананьня абавязацельстваў перад дзяржавай, разьліку з МТС і ссыпкі фондаў, на адзін дзень прыпадае ў сем раз больш збожжа і ў тры разы бульбы чым летась. Пасьля гэтых падлікаў калгасьнікі, літаральна, б'юцца за працадзень.

Ні аднэй адлучкі без дазволу калгасу.

Яшчэ лепш сталі працаваць калгасьнікі, як мы поўнасьцю здалі дзяржаве жыта па абавязацельствах і выдалі авансы. Лепшыя калгасьнікі ў нас атрымалі ад 20 да 30 кгр. жыта авансам, тады як лодырам — 1,3 кгр.

Жыта на плошчы ў 146 га ўбрана поўнасьцю за 8 дзён. З дзяржавай разьлічыліся таксама. Сёньня разьлічымся з МТС.

Ільну выцерабілі 30 гэкт., з іх 18 га ачосаны і замочаны.

Для пасеву азімых заарана і забаранавана 40 гэкт. чыстага папару. Падрыхтавана насеньне. Пад жыта вывезена ўжо 200 вазоў гною. Апроч

„ПАЛІТАДДЗЕЛЫ МТС ПЕРАТВАРАЮЦЦА Ў САПРАЎДНЫЯ ЦЭНТРЫ ЗГУРТАВАНЬНЯ ЛЕПШЫХ ПЕРАДАВЫХ ЭЛЕМЭНТАЎ КАЛГАСНАЙ ВЁСКІ“

(з пастановы ЦК УсеКП(б)

Разам з масамі, на чале мас

Калгасы зоны МТС у Аршанскім раёне пачынаюць выходзіць у рады перадавых, «задаваць тон» астатнім калгасам раёну. Уборку жыта ўсе калгасы МТС закончылі да 12 жніўня. Першымі яны пачалі здачу дзяржаве збожжа, першымі ўзяліся за перавороўванне папараў пад засеў азімых. 13 жніўня рад калгасаў зоны МТС — «Труд», «Рабочая культура», «Чырвоная горка», Пішчалаўскага сельсавету, «Ленінская іскра», «Чырвоная Харкаўка» і інш., выканалі свой гадавы план па здачы жыта.

Можна з упэўненасцю сказаць, — гаворыць пач. палітаддзелу т. **Разумаў**, — што такая задача, як здача дзяржаве высокаякаснага збожжа з першага абмалоту, глыбока прасякнула сабой сьвядомасьць калгаснікаў.

А гэта — галоўнае. Толькі ростам сьвядомасьці, вытворчай актыўнасьці калгаснікаў тлумачыцца тое, што пасьля распрацоўкі інструкцыі НКЗ СССР аб ахове ўраджаю, у пераважнай частцы калгасаў зоны МТС былі на ініцыятыве калгаснага актыву створаны каравульныя каманды, вартавыя пасты як у полі, так і каля гумнаў, паладжана праверка работы камбайн і пастоў.

Можна прывесьці нямала прыкладаў, калі паасобныя сельсаветы і рад калгаснікаў, якія раней зрывалі, зацягвалі сяўбу, зараз ідуць упередзе. Лепшы прыклад падае **Баранскі** сельсавет, аб рабоце якога падрабязна гэтымі днямі пісала «Зьвязда» (№ 178, 14 жніўня).

Рашаючую ролю ў пераломе, у тэмпах работы калгасаў адыграла правільная арганізацыя працы, укараненьне ў зьвеньні і брыгады сацыялістычных форм і мэтадаў яе.

У калгасе **«Чырвоныя Яромкавічы»** ўсе зьвенні жней заключылі паміж сабой спаборніцтва на хутчэйшую і добраякасную ўборку збожжа. Гэта спаборніцтва не засталося на паперы. Яно праявлялася як унутры калгасу, так і шматпаражкай МТС «За бальшавіцкія калгасы» і дало каштоўныя рэзультаты. Зьвяно **Ключэўскай Мані** заваявала першае месца. Кожная калгасніца гэтага зьвяна — **Фралова А., Цэханская Ф., Сульчанкова Н., Ражкова Хр., Чарнякова Х.,** і інш.— выкналі ў дзень па 0,20 га жыта.

Зараз у калгасе шырока разгарнулася сацспаборніцтва, выклікі, дагавары паміж машыністамі малатарань, трактарыстамі, вагаўшчыкамі, рахункаводкамі.

«Сакрэт» гэтага росту актыўнасьці і ініцыятывы калгаснікаў — у мэтадах работы палітаддзелу, які аддае галоўную ўвагу згуртаваньню вакол сябе актыву.

Яшчэ да пачатку жніва палітаддзел арганізаваў праверку кіруючых і гаспадарчых кадраў у калгасах і старшынь, брыгадзіраў, вагаўшчыкоў, кладаўшчыкоў, рахункаводаў і інш. Праверка дала даволі добрыя вынікі. Рад злачынстваў быў выяўлен у калгасе «Чырвоны бераг», на чале якога сталі кулацкі агент Мірончык, Галькевіч — былы абшарнік, ред спэкулянтаў, кулакоў і інш. У калгасе «Перамога», Баранскага сельсавету, улік працы вёў былы ўпраўляючы маёнткам; у калгасе імя 1-га мая, рахункаводам была дачка генэрала; у калгасе «Новы сьвет» заладаў МТФ былы кулак Стахоўскі, які зьнішчаў маладняк, а, між тым, зьяўляўся старшынёй рэвізійнай камісіі сельсавету, калгасу і... ушаўнаваженым РВК па выбракоўцы стада ў МТФ сельсавету.

Такіх фактаў праверка выявіла ня мала. Ясна, што вялікая работа па ачыстцы калгасаў ад клясава-варожых элемэнтаў не магла быць праведзена сіламі самога палітаддзелу.

Прычыны посьпехаў у тым, што работнікі палітаддзелу былі цесна зьвязаны з масамі, узбуджалі, арганізоўвалі і ўпачаткавалі іх актыўнасьць. Кожны дзень на адрас палітаддзелу паступалі ад калгаснікаў лісты, заявы, паведамленьні. Няма таго дня, каб да работнікаў палітаддзелу не зварочваліся калгаснікі з вуснымі заявамі. Яшчэ старшыня калгасу «Чырвоны партызан» ня ведаў, што ў калгасным таку краялі жыта, а да начальніка палітаддзелу Разумава прыбег калгаснік і расказаў хто, калі і колькі ўкраў.

Калгасніца з «Новага сьвету» напісала ў палітаддзел аб тым, што ў калгасе акапаўся кулак Стахоўскі; калгаснік з «Вернага шляху» падаў заяву аб тым, што ў калгасе камандуюць кулакі Шышкоў Н., Колба і інш.

Гэтыя лісты і заявы — лепшы паказальнік таго, якой папулярнасьцю, аўтарытэтам і давер'ем карыстаецца палітаддзел у шырокіх калгасных масах, гэтыя лісты — лепшы адказ на пастанову студзеньскага пленуму ЦК УсеКП(б) аб стварэньні палітаддзелаў.

Зразумела, такая цесная сувязь паміж калгасным актывам і палітаддзелам не зьявілася сама па сабе, самацёкам. Гэта рэзультат пэўных мэтадаў, форм работы палітаддзельцаў. Работнікі Аршанскага палітаддзелу тры чвэрці свайго работага часу — ад усходу да заходу сонца праводзяць на полі, у брыгадзе, у зьвяне, ля малатарні. Там яны вывучаюць калгаснае жыцьцё, жывых людзей, «на-хаду» дапамагаюць брыгадзірам, зьвеньнявым, партарганізатарам выпраўляць свае памылкі, належным чынам паладзіць працу. Палітаддзельцы ведаюць калгасны актыў не па анкетах, а па іх рабоце.

У рабоце калгасаў зоны Аршанскай МТС ёсьць яшчэ шмат недахопаў. І ў арганізацыі, і ў тэмпах, і ў якасьці працы. У радзе калгасаў, асабліва **Крапівеньскага** сельсавету, выклікі разрыў паміж жнівом, уборкай, малацьбой. На ліквідацыі гэтых недахопаў палітаддзел згуртоўвае зараз сваю ўвагу.

В. Даль.

Дзеці калгасьнікаў—на варце ўраджаю

КЛІМАВІЧЫ.

Па ініцыятыве палітаддзелу Клімавіцкай МТС разгарнулася мабілізацыя дзяцей для збору калосьсяў і аховы ўраджаю. У калгасе **«Камінтэрн»**, Лазовіцкага сельсавету арганізавана дзіцячая брыгада з 18 чал. Брыгада сабрала 30 мяхоў калосьсяў, пакінутых у полі пасьля жніва. Дзеці выпускалі на полі сваю газэту.

У калгасе **імя Карла Маркса** арганізаван атрад дзяцей, пад кіраўніцтвам піянэра Давыдава. Атрад сабраў да 5 мяшкоў калосьсяў. Акрамя таго, дзеці дапамагалі ахове ўраджаю і сушцы сена.

Пасманьнік.

ПЕРШЫЯ КРОКІ ПАЛІТАДДЗЕЛУ

Тав. Прасмушкін у Шклоўскім палітаддзеле МТС працуе толькі паўмесяца. Ён прызначан намесьнікам начальніка палітаддзелу па партыйна-масавай рабоце. Начальніка яшчэ няма, значыць, тав. Прасмушкін пакуль што і начальнік. Ёсьць памочнік начальніка па камсамольскай рабоце тав. Казлоў, па апэрацыйнай—тав. Быкаў, ды яшчэ са кратар.

Малады яшчэ палітаддзел, не ўкамплектаваны, толькі 15 дзён як пачаў разгорнутую работу. А колькі ўжо зроблена! Справа ідзе аб мэтадах работы, так сказаць, аб яе стылю. А стыль работы палітаддзельца многіх і многаму вучыць.

Прасмушкін малады гадамі чалавек, але не малады член партыі, ужо праверан на кіруючай раённай партыйнай рабоце. За апошні час вучыў ся ў тарфяным інстытуце. Туды яго паслала партыя і адкілкала, паслала на адказнейшы вучастак працы—у палітаддзел МТС.

У таварыша Прасмушкіна, яшчэ не распакаваны рэчы, а ён ужо на вялёсыпедзе імчыцца ў калгасы. Спачатку—у Александрыйскі сельсавет, лепшы, чырвонасьцяжны. Вывучыць яго вопыт, перанесьці ў адстаючыя.

— Як-жа вывучыць? З каго пачаць? Тав. Прасмушкін рашае: пачынаць з поля, з асобных калгаснікаў і калгаснік, праводзіць з імі гутаркі, потым пераходзіць да брыгадзіра, да праўленцаў, да старшыні калгасу, сельсавету, сакратара партячэйкі.

Першае спатканьне в селянінам—калгаснікам адбываецца на станцыі Копысь. Старык возіць дровы. Недаверліва паглядае на незнаёмага, ў чорнай скуранай курткі, які да яго падыходзіць.

— Добры дзень, дзядуля!—вітае старыка т. Прасмушкін.

— Добры дзень,—адказвае стары і хмыліцца ад шчырага прывітаньня.

— Адкуль, дзядуля?

— Ды з калгасу «Заветы Ільліча», недалёчка адсюль...

А вы-ж хто такі? у сваю чаргу пытае.

Коратка тав. Прасмушкін расказвае аб тым, хто ён, а дзядулю прапануе сказаць што-небудзь аб сваім калгасе, пазнаёміць з парадкамі.

— Усё было-б добра, толькі вось кумаўство заядае. Дайце старшыню калгасу камуніста,—коратка заўляе дзед.

У блёкноце палітаддзельца ляглі першыя запісы. Тав. Прасмушкін ідзе далей. Вось калгас імя Луначарскага. Поле. На полі гурт коняй і коноў.

Прасмушкін у гутарцы з коньмам выявіў, што ён высланы кулак. У калгасе гэты клясавы ворог праводзіў цэлы рад злачынстваў і ніхто на гэта не рэагаваў.

У гэты-ж дзень па прапанове палітаддзелу праўленьне калгасу атрымала распараджэньне: зьняць Вільчынскага з канюхоў, а міліцыі ўбрать яго з калгасу як клясава варожы элемант.

Так быў выкрыт палітаддзельцам першы кулак, які на вачох усіх доўгі час вёў сваю антысавецкую работу, спакойна стаяўшыся на пасадзе конюха.

Шмат кулакоў ужо выкрыта палітаддзелам і вытнана з калгасаў, толькі далёка яшчэ ня ўсе.

Камуна імя Молатава. Падрыхтоўваецца ток для малацьбы. Старшыня калгасу Ухналёў, сакратар партячэйкі Жукаў—з рыддзёўкамі працуюць да поту. Гэта ня дрэнна. Але-ж калгаснікі не арганізаваны. [illegible]

Надыходзіць дождж. Тут-жа калі току, не зьвязаныя снапы збожжа. Ніхто гэтага не бачыць—палітаддзелец уба чыў. Ухналёў і Жукаў завіхаюцца на таку...

— Таварышы, дождж надыходзіць, вязаць жыта трэба,—гаворыць тав. Прасмушкін.

— Ай, верна: вязаць, вязаць, вязаць, —усе на поле—крычаць Ухналёў і Жукаў.

Так выкрываецца і выпраўляецца перараспарадчасьць, наўменьше арганізаваць сілу.

«Глупасная» справа—жорны. Але колькі на іх псуецца збожжа, колькі дабра тайна перамалываецца.

У хаце камуніста Кірылавіча чуе тав. Прасмушкін гуд каменьняў: тут меляць на жорнах. Заходзіць.

— Чаму, цётка, так груба мелеце?—пытае з усьмешкай.

— Эт, пакуль, сылалі... Некалі... Хлябец нічога сабе будзе.

А вечарам—сход партячэйкі. На сходзе—«навіна».

— Таварышы, у камуне жорны працуюць ва ўсю, нават у камуністаў — гаворыць тав. Прасмушкін.

— Як? Што? Дзе? У каго?—зьдзіўлены, «нявінныя» галасы.

— Я-ж сам іх разьбіваў,—нервуецца старшыня камуны Ухналёў.

Устае «камуніст» Кірылавіч і саромліва прызнаецца:

— У мяне...

Чаму камуністы (а тут ёсьць і добрыя камуністы) нічога ня ведалі? Таму, што былі адарваны ад мас, з масамі ня гутарылі.

І яшчэ. Старык рамантуе інвэнтар. Тут-жа робіць драўляныя вёдры.

— Каму вёдры, дзед?—пытае тав. Прасмушкін.

— Сабе. Трэба-ж зарабіць апроч усяго іншага...

— А прападні пішуць?

— Ды пішуць-жа.

— Так, так... Дарма пішуць!

Вецікі другі дзед вяка. І тут палітаддзельцу цікава пабыць, трэба пагутарыць.

— Якая норма, старычок-дзядуля? Колькі ў дзень зьбяжаш?

— А хто яе ведае: калі тры, калі дзе сятак.

— А прападзень пішуць?

— Пішуць.

Так высьвятляецца разбазарваньне працадзён. На высьвятленьні справа не канчаецца: нібы, тут-жа выпраўляюцца. Гэта—аб «дробязях», якія часта рашаюць самыя вялікія справы. А вось больш буйныя непаладкі, скажэньні ды рэкты ў партыі. Як іх выяўляе і выпраўляе палітаддзел МТС?

Аляксандрыйскі сельсавет. У сельсавет убягае старшыня калгасу Хадзько.

— Тав. старшыня сельсавету, я паслаў 10 фурманак за пуняй аднаасобніка, якую мы ад сельсавету купілі два гады назад...

— Ну і добра,—адказвае той.

— Не, пачакай,—умешваецца тав. Прасмушкін,—што гэта за пуня?

— Ды аднаасобніка. За няўплату ня доімкі прадана...

— Пастой, а можа нядоімка выплачана?

Капаюцца. Высьвятляецца: так, нядоімка даўно выплачана, гэты аднаасобнік—акуратны плацельшчык. Былы старшыня сельсавету за скрыўленьне лініі партыі зьнят і асуджан.

Тав. Прасмушкін робіць распараджэньне:

— Неадкладна вярнуць фурманкі. Спыніць парушэньне рэвалюцыйнай законнасьці. Гэты аднаасобнік—заўтрашні калгаснік. Людзей і коняй, што пасалі за пуняй, паставіць на працу. Колькі вырацуюць за гэты астатак дня, запісаць, а недахоп да нормы—сьпісаць са старшыні калгасу за галавацяпства, нерасправдачасьць, запісаць калгаснікам, якіх ён пасылаў за пуняй.

Дайшлі весткі да палітаддзелу, што ў калгасе «Энэргія» разьмеркавалі сярод калгаснікаў 35 пуд. збожжа, а дзяржаве нічога ня здалі. У калгасе імя тав. Калініна разьмеркавалі 22 пуды, ва «Ўдарніку»—12 пуд.

— Заўтра-ж вечарам экстраная нарада старшынь калгасаў, а раніцай, да пачатку работ, усе камуністы—па калгасах, прафесьцы мітынгі, даць адпор кулаку, на яго выязку адказаць чырвонымі абозамі,—прапануе палітаддзел.

Разьбіліся па пунктах. Тав. Прасмушкіну дастаўся калгас імя Молатава. Тут саўнаў і сход трактарыстаў. Прысутнічае загадчык вытворчага вучастку, агранам. Падыходзіць тав. Прасмушкін.

— Што там у доме робіцца?—пытае таварышоў, што балагураць на прызьбе.

— Там—калгаснікі,—адказ. Палітаддзелец у хату.

— Добры дзень! Чым заняліся, таварышы?

— Ды вось, хлябца намалацілі.

— Колькі?

— 22 пуды.

— А ведаеце закон: у першую чаргу дзяржаве?

— Ведаем... Ня ведаем...

І пайшлі, і пайшлі перакідвацца моцнымі словамі: адны дзяржаве ўперад другія—сабе.

Аказваецца, старшыні калгасу Куракову даў дазвол на разьмеркаваньне збожжа агранам вучастку МТС Шафрун.

Што-ж рабіць—жыта змолата! Прапануе тав. Прасмушкін.

— Не разьмяркоўваць пакуль што, пачакаць. Разтарнуць малацьбу. Калі намалоціце 220 пудоў—22 пуды разьмеркаваць, як 10 проц. абмалоту.

Усе задаволены. На заўтра ўжо поўным тэмпам гудзелі малатарні.

А ў вечары была нарада ў сельсавеце. Кулацкія манэўры ўскрылі. Старшыні абавязаліся: збожжа—у першую чаргу дзяржаве. З нарады пайшлі праверыць начных вартаўнікоў.

Моцнае кулацкае супраціўленьне спаткаў палітаддзелец у справе мэханізацыі сельска-гаспадарчых работ, асабліва па ільну, у многіх калгасах. І ня толькі ў калгасах: агранам вучасткова Шафрун і той, пад дудку кулака, крычыць:

— Не патрэбны «камсамолкі». Справімся і так!

А тыя, машыны, што ўжо на вучастку, пушчаюцца на горшы, паблытаны лён.

Але калі ільнацерабілкі «Камсамолкі» цягаюць трактары, дык і воралі мэханізацыі неяк міруцца. Вось, калі коняй трэба запрэгчы ў машыны—ніяк!

І вынік сумны: з 62 ільнацерабілак і зараз толькі 30 пушчана на трактарох, а 32 фактычна зусім не працуе, з іх 9 яшчэ ня ўзята са складу МТС.

Яшчэ горш з машынамі па ачосу га ловак ільну, асабліва Гільштэйна. Іх не бяруць са складу. Тыя, што ўзяты, ня пушчаны ў ход. Абмалот, ачос ільну амаль не распачат ва ўсім раёне. Кулак пусьціў байку:

— Зарэжам коняй машынамі!

Разрыў паміж ільнацерабленьнем ідзе і ачосам расьце, ды і церабленьне ідзе не такімі тэмпамі, якімі трэба.

Тут кулацкае супраціўленьне яшчэ не пераможана. Палітаддзелу прыдзецца шмат папрацаваць.

Сур'ёзным пытаньнем зараз заняўся палітаддзел, гэта—плянаваньне. Як плянавалі ў МТС летась? Плянавалі га бінэтна, ня спускаючыся ў нізы, да мас, плянавалі проста па-цкодніцку: бралі курс на выцясьненьне збожжавых з севазвароту.

Агульная плошча пахаці ў калгасах МТС складае на 17.480 гэктараў, летась было засеяна 3.690 гэкт. жыта, або каля 21 проц. Сёлета заданьне—6.600 гэкт. жыта, або 37,8 проц. пахатнай плошчы, або 78 проц. росту ў параўнаньні з мінулым годам.

Атрымалася, што асобным калгасам, напрыклад, «Энэргія», па севазвароту вызначана 45 гэкт. азімага кліну, а сеяць трэба 70 гэктараў. Яшчэ горш у калгасе «Заветы Ільліча»: па севазвароту азімы клін—115 гэкт., плян-жа слуўбы на гэты год—160 гэкт., папару падрыхтавана толькі 26 гэктараў.

І з плянаваньнем палітаддзел МТС спупчаецца ў масы, у нізы. Гэта—зарука посьпехаў.

Палітаддзел узяўся за арганізацыю моцнага, сапраўднага вытворчага вучастку МТС.

Ён перш-на-перш узяўся за арганізацыю моцнага цэнтру вытворчага вучастку, гэтай кіруючай адзінкі МТС. Сюды павінны сьцякацца калгасныя масы, тут будзе цэнтр кіраўніцтва.

Раней аграномы вучастку, загадчык, мэханік туляліся дзе папала. Зараз на вучастку, напрыклад, Аляксандраўскім, абсталёўваецца кулацкі дом, тут будуць кватэры для кіруючых работнікаў МТС, тут будуць хата-чытальня, пуні, навесі для машын, тут будзе і палітычна-масавая, і культурная работа, тут будзе адбывацца і дробны рамонт машын.

Палітаддзел Шклоўскай МТС, хоць ён і малады, хоць і не ўкамплектаваны поўнасьцю, паказаў, ужо якое вялікае значэньне ён мае.

Мы паказалі першыя крокі Шклоўскага палітаддзелу МТС, у прыватнасьці і галоўным чынам на прыкладзе работы тав. Прасмушкіна. Ёсьць поўная ўпэўненасьць, што ў бліжэйшы час палітаддзел шклоўскай МТС пакажа новыя прыклады бальшавіцкага кіраўніцтва калгасамі. Зарука гэтаму—перабудова партыйнай сыстэмы, арганізацыя вытворчых ячэек, якая ўжо дакончваецца.

Сувязь з масамі—важнейшая умова посьпехаў палітаддзелу. Палітаддзельцы апублікавалі ў газэце ліст да калгаснікаў з просьбай зварачацца да іх у любы час, і кожны даў свой хатні адрас.

А. М.

У БАРАЦЬБЕ ЗА ЧЫРВОНЫ СЬЦЯГ

БЯГОМЛЬ.

Калгас «ВОЛЬНАЕ ЖЫЦЬЦЁ» масавую ўборку азімых пачаў 1-га жніўня. Перад выхадам у поле былі вызначаны вучасткі першачарговай уборкі, каб ня зжаць зялёным ні аднаго коласа, каб не дапусьціць перасьпяваньня збожжа.

Першы дзень жніва зьявіўся днём упартай барацьбы груп і брыгад жней за выкананьне прынятага калгаснікамі пляну ўборкі. Разультаты першага дня былі абмеркаваны на лятучых мітынгах у полі. У гэты дзень пляршынства заваявала групавод брыгады Ставера НАСТА ЧЭЧА, якая за адзін дзень дала норму 3,5 працадзён. На мітынгу ўдарніца НАДЗЯ ГЕРАСІМЁНАК усхвалявана заявіла, што ёй крыўдна, што яе апярэдзіла Наста, але яна сябе яшчэ пакажа.

На працягу 8-мі дзён ішло сацспаборніцтва паміж брыгадамі і групамі. Групы выпучалі паставых, якія правяралі работу і выкрывалі тых, хто ў пагоні за колькасьцю забывае пра якасьць, хто ўбірае няспелае жыта.

Атрады піянэраў зьбіралі каласы. Аб'язчыкі і вартаўнікі пільнавалі кожны сноп калгаснага ўраджаю. Уборка праведзена бліскуча — на полі не засталося ні аднаго коласа. Ураджай перавысіў уклікія меркаваньні. Выбарачная малацьба паказала, што УРАДЖАЙ ПА ЖЫТУ ПЕРАВЫШАЕ 12 ЦЭНТН., ПА ЯЧМЕНЮ — 14 ЦЭНТН.

У жніве перамагла Надзя Герасімёнак, яна за 8 дзён выпрацавала 2 працадзён.

У сваім рапарце палітаддзелу МТС калгаснікі адзначаюць, што за ўвесь час ня было ні аднаго выпадку нявыхаду на работу і невыкананьня норм. 50 чалавек выканалі звыш 150 проц. нормы кожны.

Калгас ПЕРШЫМ У РАЁНЕ ДА 10 ЖНІЎНЯ ПОЎНАСЬЦЮ ВЫКАНАЎ ПЛЯН ПАСТАВАК ЖЫТА І ЯЧМЕНЯ, ПОЎНАСЬЦЮ УНЁС НАТУРПЛАТУ МТС, ЗАСЫПАЎ НАСЕННЫ І СТРАХАВЫ ФОНДЫ І ПРЫСТУПІЎ ДА РАЗЬМЕРКАВАНЬНЯ ЎРАДЖАЮ СЯРОД КАЛГАСНІКАЎ. На працадзень у калгасе прыпадае звыш 5 кілр. жыта. Такія ўдарнікі, як Наста Чэча атрымаюць да 300 пудоў аднаго толькі жыта.

Зараз калгас разгарнуў уборку аўса.

Калгас «Вольнае жыцьцё» дабіўся такіх вялізарных посьпехаў у гэтым годзе ўпяршыню. Гэта перш за ўсё рэзультат арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасу і энэргічнай баявой работы палітаддзелу.

Калгас змагаецца за пераходны сьцяг палітаддзелу і за права трапіць на ўсесаюзную чырвоную дошку.

ДУБОЎСКІ.

Нязьменна працуе старшыня калгасу імя Варашылава тав. ПЯТРОЎСКІ на жнівярцы, перавыконваючы нормы выпрацоўкі

ЭСКАДРЫЛЬЛЯ ІМЯ тав. КАГАНОВІЧА У ХУТКІМ ЧАСЕ ПАВІННА РЭЯЦЬ НАД ПАЛЯМІ НАШАЙ РЭСПУБЛІКІ

Уносяць і выклікаюць

Дапрызыўнікі Домжарыцкага сельсавету, Бягомльскага раёну, зрабілі суботнік па загатоўцы стожн для лесправозу. Заробленыя грошы ўносяць у фонд пабудовы эскадрыльлі імя тав. Кагановіча і выклікалі пасьледваць іх прыкладу дапрызыўнікаў Недальскага сельсавету.

* Работыя і супрацоўнікі Бабруйскага хлебазаводу адпрацавалі ў фонд эскадрыльлі 4 гадзіны, што складае 225 руб.

* Працоўныя Клімавіцкага раёну ўносяць у фонд пабудовы эскадрыльлі 626 руб. Збор сродкаў працягваецца.

* Работнікі газэты «Ўдарнік» (Сураж) уносяць у карысьць эскадрыльлі — 22 руб. і выклікалі пасьледваць іх прыкладу работнікаў райснажыўсаюзу і мясцком працасьветы.

* Рабочыя і служачыя фабрыкі імя Халтурына (Бабруйск) адпрацавалі ў карысьць эскадрыльлі імя т. Кагановіча 4 гадзіны, што складае 300 руб.

* Работнікі Сураскага райкому КП(б)Б, райсавету Асоавіяхіму ўнесьлі ў фонд эскадрыльлі імя т. Кагановіча 25 руб. і выклікалі пасьледваць іх прыкладу ячэйкі ЛКСМБ і Асоавіяхіму міліцыі, лесправгасу, МТС, лесазаводу і інш., а таксама ўсіх сакратароў яч. ЛКСМБ.

* Працоўныя Лёзьнянскага раёну ўносяць на пабудову эскадрыльлі 13.863 руб.

Пастушонак.

* Гарадоцкі раённы лясгас расчуваньнай працы сабраў на пабудову эскадрыльлі 4.378 руб.

Лапінскі.

* Работнікі рэдакцыі газэты «Бальшавіцкі сьцяг» уносяць на пабудову эскадрыльлі 48 руб.

* Рабочыя і служачыя Сьмілавіцкай арцелі валёншчыкаў «Чырвоная зорка» пастанавілі адлічыць у фонд пабудовы эскадрыльлі імя тав. Кагановіча аднадзенны заработак, што складае 500 руб. Грошы пераведзены на быг. рахунак.

Хасяневіч.

* Калектыў рабочых, ІТР і служачых саўгасу Дукора, Пухавіцкага раёну, уносьлі на пабудову эскадрыльлі свой аднадзенны заработак, які складае 348 руб. і 28 кап.

Ламака.

І. А. ЛЫЧОЎ

ВЫВЕСЬЦІ ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ НА ПЕРАДАВЫЯ ПАЗЫЦЫІ

Ліпеньскі аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б намеціў канкрэтныя мерапрыемствы па рабоце прамысловасьці БССР. Самая пастаноўка пытаньня на пленуме аб рабоце прамысловасьці зьяўляецца працягам перабудовы ўсёй нашай работы па канкрэтнай праверцы выкананьня дырэктыў партыі і ўраду.

Студзеньскі пленум ЦК і ЦКК УсеКП(б), падводзячы вынікі першай пяцігодкі, даў выразную, канкрэтную і ясную дырэктыву ў адносінах таго, што павінна быць пастаўлена ў цэнтры ўвагі ўсёй нашай гаспадарчай работы ў першым годзе другой пяцігодкі.

У рэзалюцыі студзеньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) па пытаньні пляну работ 1933 году сказана:

«Надаючы вялізарнае значэньне барацьбе за якасныя паказальнікі, усякае недавыкананьне якіх стварае прарывы ў справе накапленьня і кладзецца цяжарам на дзяржаўны бюджэт, і адзначаючы, што ў мінулым годзе мела месца ў некаторых галінах невыкананьне заданьняў па якасных паказальніках, а часам і пагоршэньне становішча ў параўнаньні з мінулым годам, — аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК прапануе ўсім гаспадарчым, партыйным і прафэсыянальным арганізацыям сканцэнтраваць у 1933 г. галоўную ўвагу на поўным выкананьні заданьняў па ўзьняцьці прадукцыйнасьці працы і зьніжэньні сабекошту, ступень ажыцьцяўленьня якіх будзе ў першую чаргу улічвацца пры ацэнцы дзейнасьці кожнага прадпрыемства і трэсту».

Гэта дырэктыва партыі павінна была стаць штодзённай праграмай работы нашай прамысловасьці, і асноўная ўвага кіраўніцтва вытворчасьцю павінна была быць зьвернута на выкананьне якасных паказальнікаў. Як-жа стаіць справа з якаснымі паказальнікамі па лёгкай прамысловасьці БССР за першае паўгодзьдзе 1933 году? Аналіз работы паасобных галін лёгкай прамысловасьці па матар'ялах абследваньня ЦКК РСІ (шэйная, шкляная, фабрыкі «Дзьвіна», «КІМ» і інш.) паказвае, што ня толькі няма адпаведнага пералому ў бок лепшага выкананьня якасных паказальнікаў, а наадварот, у паляпшэньні пагоршаньне.

Вось лічбы, якія сьведчаць аб гэтым. Заданьне па прадукцыйнасьці працы за 5 месяцаў выканана ў сярэднім на 90,4 проц., а фонд зарплаты выдаткаван на 97,3 проц. Калі выкананьне пляну па прадукцыйнасьці працы за 5 месяцаў 1933 году параўнаць з выкананьнем пляну прадукцыйнасьці працы за 5 месяцаў 1932 году, то можна прысьці да вываду, што на гэтым вучастку ў бягучым годзе справа стаіць горш. У той час, як зарплата аднаго рабочага ў першым паўгодзьдзі 1933 г. супроць 1932 г. вырасла да 105,8 проц., выкананьне пляну па прадукцыйнасьці працы за 5 месяцаў бягучага году складае толькі 86 проц. да 1932 году.

Такім чынам, дырэктыва партыі «аб сканцэнтраваньні ў 1933 г. галоўнай увагі на поўным выкананьні заданьня па прадукцыйнасьці працы» лёгкай прамысловасьцю БССР ня выканана.

А як стаіць справа са зьніжэньнем сабекошту? На студзеньскім пленуме ЦК і ЦКК УсеКП(б) тав. Молатаў у сваім дакладзе сказаў: «Узьняцьці прадукцыйнасьці працы зьяўляецца важнейшым элемэнтам у зьніжэньні сабекошту прадукцыі нашай прамысловасьці. А гэта задача — задача зьніжэньня сабекошту і ў гэтым годзе з усёй вострасьцю стаіць перад намі пры абавязковым паляпшэньні якасьці прадукцыі».

Аналіз лічбаў па зьніжэньні сабекошту паказвае, што ў гэтай галіне лёгкая прамысловасьць БССР мае яшчэ горшыя паказальнікі, чым на прадукцыйнасьці працы. Тэкстыльная прамысловасьць замест зьніжэньня на 2,6 проц. павысіла сабекошт на 7,4 проц., шэйная замест зьніжэньня на 1,6 проц. дала павышэньне на 6,5 проц., абутковая замест зьніжэньня на 0,7 проц. павысіла на 1,1 проц., шкляная, замест зьніжэньня на 4,0 проц. павысіла на 14,8 проц., гарбарная прамысловасьць павысіла сабекошт на 9,4 проц.

Факты работы асобных галін прамысловасьці паказваюць, што ня было ніякіх аб'ектыўных прычын невыкананьня якасных паказальнікаў, а наадварот мелася ўсе магчымасьці для пасьпяховага выкананьня іх. Узяць, напрыклад, шкляную прамысловасьць. Ці былі магчымасьці ў гэтай галіне прамысловасьці выкананьне паказальнікі па зьніжэньню сабекошту? Безумоўна, былі. Наша шкляная прамысловасьць у гэтым годзе мела больш танных кварцавых пяскі. Гэтыя пяскі раней завозіліся з-пад Масквы і абыходзіліся ў 35 рублёў за тону, а ў сучасны момант скарыстоўваюцца беларускія кварцавыя пяскі, каштоўнасьць якіх усяго 15-20 рублёў тона. У шкляной прамысловасьці створана ўласная топліўная база (торф). Прывозімыя ў 1933 годзе з іншых мясцовасьцяй шчолачы заменены на 35-40 проц. нефэлітам і бусульфатам, што робіць больш таннай транспартыроўку іх. Праведзен рад рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў, якія маюць сакоўнае значэньне: транспарцёры для перадачы бутэлак у зональную печку, газавая кукушка для точкі шкла, што зьмяншае выдатак газы на 40 проц., рэканструяваны печы на гутах імя Домбаля і «Кастрычнік», зроблен капітальны рамонт печак на ўсіх астатніх заводах.

Значнае павышэньне сабекаштоўнасьці ідзе за лік вялікіх агульна-заводзкіх выдаткаў, якія па шэйнай прамысловасьці дасягаюць 3,3 проц., а ў цэлым па Наркамлёгпраму — 2,3 проц.

Вялікі ўплыў на павышэньне сабекаштоўнасьці мае пераж паліва. Па тэкстыльтрэсту, напрыклад, пераж паліва складае 25,2 проц., па шклотрэсту — 28,0 проц., па скура-абутковаму трэсту— 32,5 проц., па шэйтрэсту — 16,4 проц. Да гэтага часу не ўстаноўлены нормы выдаткаваньня апалу, адсутнічае ўлік, не наладжана транспартыроўка і хаваньне. Няма вымяральных прыбораў. На фабрыцы «Везувій» ў Гомлі было ўстаноўлена, што вымяральныя прыборы дыжалі на працягу 2-х год, у той час, калі Гомельская электрастанцыя шукала іх у іншых гарадох БССР.

Прычыны—у мэтадах кіраўніцтва

Пераходзячы да аналізу прычын невыкананьня дырэктыў партыі па лёгкай прамысловасьці, неабходна канстатаваць, што гэтыя прычыны ні ў якім выпадку не зьяўляюцца прычынамі аб'ектыўнага парадку. Адсутнасьць перабудовы кіраўніцтва ў адпаведнасьці з патрабаваньнямі партыі, канцылярска-бюракратычныя мэтады яго, — вось прычына ўсіх прычын недавыканьняючай работы прамысловасьці. Аб гэтым гавораць факты. Найняліпшы прарыў у выкананьні пляну дае Белхімтрэст, у прыватнасьці завод «Чырвоны хімік» (Навабеліца).

Гэты завод зьяўляецца адзіным у Саюзе па выпрадукцыі хэмічнай крэйды і тэрма-ізаляцыйных матар'ялаў. Адным з асноўных відаў сырцу для заводу зьяўляецца даламіт, які здабываецца ў нас у Дарагававе. Распрацоўкі гэтыя з пачатку знаходзіліся ў ведальні прамкаапэрацыі, затым Белгарпрама і Белбудматар'яла. Але ніхто з іх ня слыніў драпежніцкай эксплёатацыі распрацовак і не залясьпечыў мэханізацыі гэтай важнейшай вытворчасьці. Больш таго, 29 сакавіка 1933 году Наркамлёгпрам і Наркамлёгпрам паставілі перад СНК пытаньне аб тым, што ім гэтыя распрацоўкі зусім непатрэбны і яны зноў былі перададзены прамсаюзу. Між тым, заводу «Чырвоны хімік» вельмі патрэбны 3 тыс. тон даламіту. На працягу некалькіх месяцаў ідзе жорсткая сварка між заводам і арцельяю па пытаньні дастаўкі даламіту. Арцель уноў арганізаваная — не мае ні грашовых, ні транспартных сродкаў і за ўвесь час загатовіла толькі 170 тон даламіта. Выкананьне вытворчай праграмы заводам пастаўлена пад пагрозу крыху.

Завод зноў стаўіць пытаньне аб тым, каб трэст Белхімпрам зараз-жа прыняў на сябе даламітавыя распрацоўкі, але трэст уэмоцнена захоўвае сабе спакойнае жыцьцё і выступае ў ролі амэрыканскага наглядальніка і гніла-лібэральнага кіраўніка гаспадаркай, працускаючы міма сябе абуравую валакіту.

А вось становішча справы на найбольш адстаючай фабрыцы «КІМ» у Віцебску. Унутрыфабрычныя непаладкі там зьяўляюцца бічом вытворчасьці.

З месяца ў месяц павышаюцца на фабрыцы прастоі абсталяваньня. Замест плянавых 3 проц. яны складалі ў першым квартале 26 проц. і ў другім — 25 проц.

Сапраўднае плянаваньне на фабрыцы адсутнічае. У аснову прамфінпляну трэст бярэ разьлікі на абсталяваньне, якое павінна яшчэ прыбыць.

Буйнейшая фабрыка «Дзьвіна» свой палугадавы плян выканала на 96 процантаў і павялічыла выпрацоўку супроць існуючага пэрыяду мінулага

ШЫРОКА РАЗГАРНУЎШЫ МАСАВУЮ РАБОТУ—ЗАВАЮЕМ ПЯРШЫНСТВА У САЦСПАБОРНІЦТВЕ З ЗАХ. ВОБЛАСЬЦЮ ПА ВЫКАНАНЬНІ ФІНПЛЯНУ III КВАРТАЛУ

МЕНСК

ЦК КП(б)Б—тав. ГІКАЛО, СНК БССР—тав. ГАЛАДЗЕДУ, ЦСПСБ, РЭДАКЦЫІ «Зьвязды».

Мабілізуючы, на аснове сацдагавору з БССР працоўныя масы вобласьці на пасьпяховае правядзеньне ўборкі збожжавых, цераблеьне і апрацоўку ільну, збожжапаставак, Заходняя вобласьць паставіла сваёй задачай датэрміновае выкананьне фінплян трэцяга кварталу, лічачы, што пасьпяховае выкананьне фінпляну непарыўна зьвязана з уборкай і загатоўкамі.

Выклікаем БССР на сацспаборніцтва па выкананьні наступных абавязацельстваў, на аснове сацспаборніцтва рабнаў, сельсаветаў, калгасаў, фінансавага актыву,—дабіцца выкананьня пляну мабілізацыі сродкаў да 25 верасьня 1933 году і пляну дзяржпазыкі да 1 кастрычніка. Забясьпечыць якасьць насьці з пастановай ЦК і СНК СССР ад 27 ліпеня.

Забясьпечыць чоткае выкананьне указаньняў правадыра партыі тав. СТАЛІНА, выкладзеных у прамове аб рабоце на вёсцы, пры правядзеньні кампаніі с.-г. падатку, дзяржстрахаваньня, настойліва і рашуча змагаючыся з усякімі адхіленьнямі і скажэньнямі генэральнай лініі партыі, уключыўшы ў гэту работу друк вобласьці, раёнаў МТС.

Вашу згоду пацьвярдзіце. Просім НКФ СССР тав. ГРЫНЬКО и «ЭКОНОМИЧЕСКУЮ ЖИЗНЬ» быць арбітрам.

Сакратар Зах. абкому РУМЯНЦАЎ.
Старшыня абвыканкому РАКІТАЎ.
Абпрафсавет ЧУРЫЛІН.
Рэдактар «Рабочего пути» ШЭЙДЛІНА.

***

СМАЛЕНСК

АБЛАСНЫ КАМІТЭТ УсеКП(б) —РУМЯНЦАВУ, АБЛВЫКАНКОМ — тав. РАКІТАВУ, АБЛПРАФСАВЕТ—т. ЧУРЫЛІНУ, «РАБОЧИЙ ПУТЬ» — т. ШЭЙДЛІНАЙ, АБЛАСНЫ ФІНАДДЗЕЛ — т. ДОЛГАМУ.

Ваш выклік на сацспаборніцтва паміж БССР і Заходняй вобласьцю на датэрміновае выкананьне фінпляну трэцяга кварталу прымаем. Высоўваем наступныя дадатковыя задачы.

1. Поўнасьцю рэалізаваць пазыку імя першага году другой пяцігодкі ў вёсцы да 10 верасьня.

2. Стварыць шырокі масавы актыў ударнікаў фінансавай работы ў горадзе і вёсцы. Мабілізуем шырокія масы рабочых, калгасьнікаў і ўсіх працоўных БССР, фінактыў на сацспаборніцтва для бязумоўнага выкананьня пастаўленых задач, на аснове выразнага правядзеньня ў жыцьцё геніяльных указаньняў правадыра партыі тав. СТАЛІНА.

ЦК КП(б)Б ГІКАЛО.
СНК БССР ГАЛАДЗЕД.
ЦСПСБ КАВАЛЬЧУК.
Рэдакцыя «Зьвязды» БРАГІНСКІ.
Наркамфін ХАЦКЕВІЧ.

***

МАСКВА

НАРКАМФІН САЮЗУ ТАВ. ГРЫНЬКО, РЭДАКЦЫІ «ЭКОНОМИЧЕСКАЯ ЖИЗНЬ».

БССР уступіла ў сацспаборніцтва з Заходняй вобласьцю на лепшае і датэрміновае выкананьне да 25 верасьня фінпляну 3-га кварталу. Просім вас і «Экономическую жизнь» быць арбітрам у сацспаборніцтве паміж БССР і Заходняй вобласьцю.

ЦК КП(б)Б ГІКАЛО.
СНК БССР ГАЛАДЗЕД.
«Зьвязда» БРАГІНСКІ.
Наркамфін ХАЦКЕВІЧ.

УСІМ РАЁНАМ БССР

У сувязі з уступленьнем БССР у сацспаборніцтва з Заходняй вобласьцю на лепшае выкананьне фінпляну да 25 верасьня, усім сакратаром РК КП(б)Б і старшыням РВК за подпісамі т. т. ГІКАЛО і ГАЛАДЗЕДА пасланы тэлеграмы. У тэлеграмах гаворыцца: «ЦК і СНК абавязваюць партарганізацыі, выканкомы, сельсаветы бальшавіцкім разгортваньнем масавай работы, на аснове шырокага сацспаборніцтва ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ ВЫКАНАНЬНЕ ФІНАСАВЫХ ЗАДАЧ 3-ГА КВАРТАЛУ ПА ЎСІХ ПАКАЗАЛЬНІКАХ ДА 20 ВЕРАСЬНЯ. 25 жніўня прадставіць інфармацыйнае паведамленьне аб прынятых мерах і ходзе разгортваньня сацспаборніцтва ў вашым раёне».

ЗАДАЧЫ РАБОТЫ ФІНАСАВЫХ СЭКЦЫЙ ГАРАДЗКІХ, МЕСТАЧКОВЫХ І СЕЛЬСКІХ САВЕТАЎ БССР

Бальшавіцкае выкананьне фінансавага пляну мае вялікарнае значэньне ў справе сацыялістычнага будаўніцтва. Своячасова і поўнасьцю сабраць вызначаныя на пляну прыбыткі пагаспадарчаму, эканомна, строга па пляну, выдаткоўваць сабраныя сродкі —гэта значыць ажыцьцяўляць капітроль рублём, садзейнічаць выкананьню пляну сацыялістычнага будаўніцтва. Правільна выконваць фінансавае заканадаўства пралетарскай дзяржавы—гэта правільна ажыцьцяўляць клясавую палітыку камуністычнай партыі і савецкай улады.

Вялізарныя задачы, якія стаяць перад намі ў галіне фінансаў, пасьпяхова могуць быць вырашаны толькі тады, калі ў фінансавую работу будуць уцягнуты шырокія масы рабочых, калгасьнікаў і працоўных перадавых адпаасобнікаў, калі фінансавая работа будзе правозіцца пад кантролем мас працоўных, калі на фінансавым фронце будзе ажыцьцяўляцца сацспаборніцтва, калі будуць сыстэматычна працаваць тысячы актывістаў і ўдарнікаў фінансавага фронту —энтузіястаў сацыялістычнага будаўніцтва.

Фінансавыя сэкцыі саветаў зьяўляюцца важнейшымі савецка-грамадзкімі органамі садзейнічаньня пасьпяховаму выкананьню фінансавых задач сацыялістычнага будаўніцтва.

Што-ж павінна рабіць, як павінна працаваць фінансавая сэкцыя савету, каб з поспехам выконваць усклад зеныя на яе абавязкі, каб найлепшым чынам садзейнічаць пасьпяховаму выкананьню фінансавых задач.

Фінансавыя сэкцыі саветаў павінны выконваць усклад зеныя на іх задачы шляхам уцягненьня шырокіх працоўных мас і перш за ўсё рабочых і работніц, калгасьнікаў і калгаснік. Члены сэкцый павінны добра ведаць пункты асноўныя фінансавыя законы (напрыклад, законы аб сельгаспадатку, акладному страхаваньню, самаабкладаньню, культжылзбору, рэалізацыі пазыкі і інш.) бюджэт савету, планы мабілізацыі сродкаў. Яны павінны ўдзельнічаць у фінансавай рабоце ня толькі сваім прысутнічаньнем на пасяджаньнях сэкцыі, а сыстэматычна, на справе, выконваць паасобныя заданьні.

Для ажыцьцяўленьня масавай і практычнай дзейнасьці фінансавай сэкцыі неабходна:

Разьмеркаваць паасобныя вучасткі работы (бюджэт, абавязковыя і добраахвотныя плацяжы насельніцтва, плацяжы аграмаджанага сэктару) паміж паасобнымі членамі сэкцыі, вылучыць адказных за работу па даручаным ім вучастку.

Перад пачаткам кожнага кварталу на агульным пасяджаньні сэкцыі члены сэкцый абмяркоўваюць канкрэтныя задачы і планы наступнага кварталу і вызначаюць мерапрыемствы па забесьпячэньні выкананьня гэтых заданьняў.

Сачыць за ходам выкананьня паасобных заданьняў, праверыць работу кожнага члена сэкцыі, шляхам масавай і брыгаднай праверкі на справе.

Выявіць у кожным калгасе, у кожнай вёсцы, на кожным прадпрыемстве сапраўдных ударнікаў фінансавага фронту, трымаць з імі сталую сувязь, прыцягваць іх да сыстэматычнай работы ў сэкцыі.

Арганізаваць палітычна-выхаваўчую работу з фінактывам, растлумачваючы фінактывістам асноўныя фінансавыя мерапрыемствы і законы.

Актыўна ўдзельнічаць ва ўсіх конкурсах на лепшы савет, сэкцыю, камісію, на лепшае выкананьне масавых кампаній і г. д.

Разгарнуць шырокую масава-палітычную работу сярод працоўнага насельніцтва вакол фінансавых задач, арганізаваўшы сацыялістычнае спаборніцтва на лепшае выкананьне канкрэтных фінансавых заданьняў паміж прадпрыемствамі, калгасамі, вёскамі і паасобнымі ўдарнікамі фінансавага фронту, шырока папулярызуючы досьпехі перадавікоў і выкрываючы канкрэтных вінаўнікаў зрыву паасобных фінансавых заданьняў.

Важнейшымі пытаньнямі работы фінансавых сэкцый саветаў павінны зьяўляцца:

Бюджэт сельсавету, абгаварэньне бюджэту на шырокім фінансавым актыве ў час яго складаньня,—грамадзкі нагляд за ходам яго выкананьня, за своячасовым атрыманьнем усіх прадугледжаных бюджэтам прыбыткаў і за правільным і гаспадарчым скарыстаньнем бюджэтных сродкаў.

Поўнае і своячасовае выкананьне пляну мабілізацыі сродкаў насельніцтва і спагнаньне плацяжоў з аграмаджанага сэктару народнай гаспадаркі.

Правядзеньне кампаній па дзяржаўных пазыках, папулярызацыя накапленьня зьберажэньняў праз ашчадкасы, поўнае і своячасовае спагнаньне паявых накапленьняў казначэйскіх.

Правядзеньне кампаній па абавязковых плацяжох—правядзеньне ўліку аб'ектаў абкладаньня, выяўленьне захаваных аб'ектаў абкладаньня, забесьпячэньне своячасовага і поўнага паступленьня плацяжоў абавязковых, добраахвотных і аграмаджанага сэктару.

Выяўленьне кулацкіх гаспадарак, барацьба з нядоімкамі кулацкіх гаспадарак, выяўленьне захаванай маёмасьці кулакоў, якія не ўплацілі ўсіх налічаных з іх плацяжоў.

Барацьба з усякімі відамі разбазарваньня, са стратамі, растратамі дзяржаўных сродкаў, барацьба са спэкулянтамі і перакупшчыкамі.

Пры гэтым кіраўнікі фінансавай сэкцыі, як і наогул усіх сэкцый саветаў, павінны ведаць, што сэкцыя савету не канцылярскі апарат, а масавая савецкая арганізацыя дыктатуры пралетарыяту, якая праводзіць сваю працу праз масы, праз савецкі актыў.

Кожны ўдзельнік фінансавай сэкцыі у барацьбе за лепшую якасьць і асартымэнт прадукцыі. Наркаматы, трэсты і прадпрыемствы павінны ўдасканаліць тэхналёгічныя працэсы, умацаваць работу лябараторый у справе апэрацыйнага, штодзённага кантролю па якасьцю паступаючага сырцу, матар'ялаў і выпускаемай прадукцыі, узмацніць кантроль за якасьцю прадукцыі ў вытворчым працэсе, павысіўшы адказнасьць усяго тэхнічнага пэрсаналу за дапушчэньне браку і нізкагатунковай прадукцыі, рашуча праводзячы ў жыцьцё матар'яльную адказнасьць бракаробаў, прыстасаваўшы сыстэму зарплаты да стымуляваньня выпуску добраякаснай прадукцыі.

Пытаньні рабочага снабжэньня

Верасьнёўскі пленум ЦК УсеКП(б) даў вядомую дырэктыву ў адносінах паляпшэньня рабочага снабжэньня. У рэзалюцыі верасьнёўскага пленуму сказана, што:

«далейшае паляпшэньне снабжэньня гарадзкога насельніцтва прадуктамі харчаваньня павінна ісьці побач з поўным выкананьнем пляну цэнтралізаваных заготовак, па лініі арганізацый дзяржаўных закупак с.-г. прадуктаў па канкэнцыйных цэнах і, галоўным чынам, за кошт разгортваньня дэцэнтралізаваных заготовак казпэрацыі, сталовых і іншых гандлёвых арганізацый, разьвіцьця калгасных базараў і стварэньня пры фабрыках, заводах і іншых прадпрыемствах уласных харчовых баз (гароды, малочныя гаспадарні, сьвінагадоўля, трусаводзтва, пчаляніцтва, прудовая гаспадарка і г. д.)».

Як-жа выконваюцца гэтыя дырэктывы? На радзе ЗРК пазіраецца невыкананьне пляну цэнтралізаванага снабжэньня рабочых. У большасьці выпадкаў гэта адбываецца з-за таго, што ЗРК не рэалізуюць тых нарадаў, якія ім даюцца.

Да ўсім ненармальнага становішча і прастога снабжэньня дырэктыў партыі прыводзіць няправільнае пераразмеркаваньне фондаў у бок зьніжэньня норм асноўным вядучым прадпрыемствам, уватым на цэнтралізаванае снабжэньне, за кошт павялічэньня норм другога і трэцяга сьпісаў.

Вось прыклады. Першаму сьпісу належала круп 3,15 кгр. на квартал, а Белкавпхарч урэзаў да 1,60 кгр., рыбы належала на квартал 3 кгр., а выдавалася 2 кілё. У тон-жа час на 2-му сьпісу, замест належачых 0,87 кгр. круп адпускаецца па кілё, рыбы, замест 0,84 кгр. адпускалася таксама кілё.

Дэцэнтралізаваны загатоўкі зьяўляюцца адным з важнейшых відаў паляпшэньня снабжэньня рабочай клясы. Дырэктывы аб дэцэнтралізаваных загатоўках ня раз давалися партыяй і ўрадам. А як стаіць справа на гэтым вучастку? Фабрыка «Дзьвіна» выканала плян дэцэнтралізаваных загатовак усяго на 7,4 проц. «Сьцяг індустрыялізацыі» — на 5 проц., менская абутковая фабрыка — на 15,7 проц.

мяркоўзе па чарзе, але зусім не паўдарнасьці.

Ударніка-брыгадзірша брыгады шкодлівага цэху, **тав. Гершон,** гаворыць:

— Розьніцы ў снабжэньні ўдарнікаў і не ўдарнікаў у нас ніякай няма. У мяне ў брыгадзе ёсьць такія і такія, а снабжаюцца ўсе аднолькава.

Усе гэтыя моманты, вядома, не вызначаюць становішча пераважнага снабжэньня ўдарнікаў. Адпаведныя зрухі ў гэтых адносінах мы, бязумоўна, маем, але недахопаў у гэтай галіне ў нас таксама шмат. Прыведзеныя факты гавораць аб тым, што яшчэ абсалютна невыстарчальна барацьба ўсіх нашых арганізацый за лепшага ўдарніка, за пераважнае яго снабжэньне, за вылучэньне ўдарніка з агульнай рабочай масы, за вызначэньне месца ўдарніка ва ўсёй нашай сацыялістычнай прамысловасьці.

Верасьнёўскі пленум ЦК УсеКП(б) вызначыў і задачы па паляпшэньні грамадзкага харчаваньня.

«Задача заводаў, фабрык, транспарту і іншых прадпрыемстваў, — гаворыцца ў рэзалюцыі пленуму, — у даных умовах заключаецца ў тым, каб ня толькі мець казпэрагыў і сталовую, але і свае с.-г. прадпрыемствы, якія даюць прадукты харчаваньня для снабжэньня рабочых».

Мы маем вялікія дасягненьні ў справе разьвіцьця грамадзкага харчаваньня. Гэтым відам снабжэньня ахопліваецца ўсё большая колькасьць рабочых. Аднак, матар'ялы, якія мы маем, гавораць аб тым, што належнай барацьбы за справу грамадзкага харчаваньня, за справу ня толькі «карыёзкі», але за культурную пастаноўку грамадзкага харчаваньня, за такую сталовую, дзе рабочы мог-бы паабедаць і адпачыць — мы яшчэ ўсюды ня маем.

Якасьць у большасьці абсьледаваных сталовых па-ранейшаму нездавальняючая. Ёсьць факты яўнага псаваньня прадуктаў. На фабрыцы «Сьцяг індустрыялізацыі» у абед далі адну толькі бручку, прычым дрэнна прыгатаваную. У маі рабочы далі абед: першае блюда — абсалютна поснае, а другое — недаварваная рыба. Гэта выклікала абурэньне рабочых.

Такія адносіны да якасьці харчаваньня рабочых выкарыстоўваю клясавы вораг. На фабрыцы былі пушчаны гутарачкі: прамфінплян выконвай, а есьці не дадуць.

Санітарнае становішча па большасьці прадпрыемстваў таксама зьяўляецца недапушчальным: катлы ня лужаны, бруд у кладовых, антысанітарнае становішча кухань і залаў. У гэтых адносінах вялізарныя задачы стаяць перад Наркамздароўя. Аднак, мэдпункты і вылучаныя санітарныя дактары слаба ажыцьцяўляюць санітарны кантроль.

У большасьці выпадкаў дрэнная якасьць харчоў тлумачыцца выключна дрэннай апрацоўкай прадуктаў і перавышэньнем колькасьці блюд, у суадпаведнасьці з адпускаемымі прадуктамі. Даводі яркім фактам у гэтых адносінах можа служыць прыклад работы сталовай дэпо станцыі Ворша. У часе чысткі парткалектыву чыгуначнікаў жонкі рабочых заявілі повару, што пры наяўнасьці прадуктаў, якія яму адпушчаны, яны згатуюць лепшыя абеды, чым да гэтага часу гатавала сталовая. Гэта яны даказалі. У дзень пры гатаваньні харчу жонкамі рабочых, в тэй-жа нормы прадуктаў абеды атрымаліся значна лепшыя і рабочыя былі вельмі давольны іх якасьцю.

Гэты прыклад сьведчыць аб тым, што галоўны недахоп у рабоце сталовых—гэта невыстарчальная арганізацыя самога грамадзкага харчаваньня, адсутнасьць барацьбы за культурнае прыгатаваньне стравы, за яе якасьць, адсутнасьць належных клопатаў аб патрэбах рабочых.

Барацьба з раскрадваньнем і растратамі ў сыстэме грамадзкага харчаваньня праводзіцца абсалютна невыстарчальна. Растраты маюць месца на радзе буйнейшых прадпрыемстваў: на фабрыцы **«Дзьвіна»** — 13.500 руб., гуце імя **Домбаля** — 13.700 руб. На паасобных прадпрыемствах пакражы праводзяцца з ведама адміністрацыі. У сталовай імя **Клары Цэткін** адміністрацыяй фабрыкі было адпушчана 300 тыс. руб. на паляпшэньне снабжэньня рабочых. Гэтыя грошы былі прысвоены адміністрацыяй сталоўкі. Штодзённа з фабрычнай сталоўкі вывозілася 100-120 абедаў арцелям, якія ніякіх адносін да фабрыкі ня маюць, прычым грошы за гэтыя абеды забіраліся адміністрацыяй сталоўкі **Глушкіным і Сьпічным.**

Усё гэта адбывалася на вачох партыйнага кіраўніцтва, фабрычна-заводзкага камітэту, якія не зварачвалі ніякай увагі на скаргі і заявы рабочых.

Пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б канстатаваў, што створаныя пастановай ЦК УсеКП(б) новыя арганізацыйныя формы рабочага снабжэньня да гэтага часу не ў выстарчальнай ступені скарыстаны гаспадарнікамі для паляпшэньня снабжэньня рабочых.

Гаспадарчыя, казпэрацыйныя, партыйныя, прафсаюзныя і камсамольскія арганізацыі павінны рашуча перабудаваць работу, умацаваць клясавую пільнасьць у сыстэме рабочага снабжэньня, узмацніць рабочы кантроль, ахоўваючы гэты вучастак работы ад шкодніцтва, зладзеяў і растратчыкаў.

Стан прамысловага будаўніцтва

За апошнія гады партыяй і ўрадам былі прад'яўлены жорсткія патрабаваньні ў адносінах упарадкаваньня будаўніцтва. Аднак, на гэтым вучастку мы яшчэ маем рад прарываў. Па буйнейшых аб'ектах Наркамлёгпраму да апошняга часу няма разгорнутых тытульных сьпісаў, зацьверджаных пракстаў і каштарысаў (завод імя Домбаля, касьцяапрацоўчы і г. д.). І гэта ў першую чаргу адбіваецца на такіх прамысловых цэнтрах, як Віцебск, Магілёў, дзе праграма за паўгодзьдзе выканана на 10—17 проц.

Як адзін з буйных недахопаў, неабходна адзначыць распыленасьць і паза плянавае будаўніцтва па лініі **Белпрамбудтрэсту і Наркамлёгпраму.** Ацрача 45 плянавых аб'ектаў, з якіх па 15 аб'ектах у першым квартале і 14 аб'ектах у другім зусім не вялося работы, Белпрамбудтрэст выконваў яшчэ дробныя будаўнічыя работы ад тысячы да 30 тыс. руб. па 13 па-за плянавых аб'ектах. Зусім не пачаты работы па такіх буйных і важных аб'ектах, як менская абутковая фабрыка (325 тыс. руб.), гарбарня **«Бальшавік»** (133 тыс. руб.), **«Сьцяг індустрыялізацыі»** (155 тыс. руб.). Зусім нікчэмны процант выкананьня будаўнічых работ па фабрыцы **«КІМ»** — 9,2 проц., голкавай фабрыцы — 1,4 проц., віцебскай друкарні — 0,12 проц., фабрыцы «Дзьвіна» — 8,4 проц., косьцяапрацоўчым заводзе — 8,4 проц.

Нытаньні сабекошту будаўніцтва на аснове рашучай барацьбы з расхлябанасьцю, з недысцыплінаванымі элемэнтамі ў арганізацыі, на аснове рашучай барацьбы з кулаком і яго агентурай, забясьпечыць належны пералом у правядзеньні важнейшых гаспадарча-палітычных кампаній па Аршанскаму раёну.

Зараз ужо можна бачыць, што пачатак пералому ёсьць. У рэзультаце канкрэтнага кіраўніцтва і практычнай дапамогі з боку ЦК на чале з т. Гікало мы дабіліся наступных шаказальнікаў у правядзеньні летніх сельскагаспадарчых работ:

— Зараз-жа пасьля атрыманьня тэлеграмы ЦК партарганізацыя раёну была мабілізавана на завяршэньне веснавой сяўбы. У выніку да 10-га чэрвеня плян пасеўнай быў выканан, а гэта значыць, што за апошнюю сямідзёнку было выканана 40 проц. пляну веснавой сяўбы;

— да 20-га чэрвеня гародніна культуры былі праполаты на 210 проц., тэхнічныя на 118 і збожжавыя па 175 проц.; 1-га ліпеня плян уздыму папараў быў поўнасьцю выканан, а на 15-е ліпеня — перавыкананы на 30 проц.;

— плян касьбы і ўборкі сена быў выканан на 20-VII на 100,04 проц.;

— на 12 жніўня плян здачы дзяржаве сена выканан на 91,8 проц., жыта было зжата на 97 проц.

Такім чынам па праполцы, уздыму папараў і сенаўборцы раён ужо заняў адно з першых месц у БССР.

Гэтыя рэзультаты нашай работы зьявіліся не ў парадку самацёка. Зараз-жа пасьля атрыманьня тэлеграмы т. **Гікало** мы правялі рад практычных мерапрыемстваў па ажыцьцяўленьні задач, пастаўленых перад намі ЦК.

Першае, за што мы ўзяліся, гэта расстаноўка сіл, мабілізацыя і згуртаваньне вакол ячэек і сельсаветаў беспартыйнага актыву, умацаваньне вясковых арганізацый за лік раённага актыву. Усё гэта праводзілася намі ў поўнай адпаведнасьці з рашэньнем ЦК аб палітаддзелах і перабудове работы вясковых партарганізацый. За апошні час намі накіравана ў калгасы ў якасьці старшыень і брыгадзіраў па пастаянную работу 25 камуністаў з раёну і 7 з тэрытарыяльных ячэек. Акрамя таго, з ліку райпартактыву на пастаянную работу ў сельсаветы, каапэрацыю накіравана 14 камуністаў, і яшчэ ў якасьці парторгаў у калгасныя брыгады накіравана з раёну 85 членаў і кандыдатаў партыі, а з тэрытарыяльных ячэек 57.

Партыйная арганізацыя правяла і праводзіць рашучую барацьбу з элемэнтамі расхлябанасьці і недысцыплінаванасьці. За апошні час зьняты з работы і выключаны з партыі рад адказных сельскіх работнікаў, якія выпадкова трапілі ў партыю, папалі пад уплыў клясавага ворага, перарадзіліся.

У мэтах мабілізацыі калгаснага актыву на пасьпяховае выкананьне гаспадарча - палітычных задач па вёсцы намі праведзены: раённы зьлёт калгасьнікаў-ударнікаў, зьлёт жанчын калгасьніц, раённая парада вопытнікаў, сельсавецкія зьлёты калгасьнікаў-ударнікаў і г. д.

Акрамя таго, мы зараз практыкуем сыстэматычную таварыскую перапіску са старшынямі калгасаў і членамі сельскіх саветаў. У гэтых таварыскіх лістох, улічваючы канкрэтныя ўмовы таго ці іншага калгасу або сельсавету, раённыя кіруючыя работнікі даюць паказаньні, робяць практычныя парады.

Надзвычай вялікую ролю ў мабілізацыі калгасных мас і працоўных адпаасобнікаў на барацьбу за тэмпы і якасьць сельска-гаспадарчых работ, асабліва па ўборцы і збожжапастаўках адыгралі ў нашым раёне чыстка партыі і палітаддзел. У адзнаку чысткі рад калгасаў правільна арганізаваў у сябе працу, датэрмінова закончыў сенаўборку і г. д. Калгасы зоны МТС першымі пачалі ўборку збожжа і здачу яго дзяржаве.

Правядзеньне праполкі, уздыму папараў і сенаўборкі выразна паказала, што Аршанскі раён мае ўсе магчымасьці быць адным з перадавых раёнаў БССР. Некаторыя посьпехі ўжо ёсьць. Аднак, іх яшчэ зусім мала. Мы зацягнулі сяўбу, недавыканалі засеў аўса. Яшчэ значна адстае аднаасобны сэктар.

Мы ня маем яшчэ належных тэмпаў і патрэбнай барацьбы за якасьць у такіх важнейшых справах, як уборка і збожжапастаўкі. У арганізацыі ня зжыты яшчэ элемэнты расхлябанасьці, недысцыплінаванасьці, дэкларацыйнасьці. Маюць месца вышадкі праяўленьня рэкардсмэнства.

Урокі веснавой сяўбы і даныя па ўраджайнасьці г. г. выразна паказваюць на неабходнасьць зараз-жа пачаць лушчэньне пожняў і падняцьце зябі, добра падрыхтаваць пад засеў жыта папар, пераараць яго, угноіць.

Адзін з важнейшых і першачарговых задач зьяўляецца правільная арганізацыя брыгад ва ўсіх калгасах, правільная расстаноўка і выкарыстаньне сіл, яшчэ больш рашучае ачышчэньне калгасаў ад клясава-варожай засьмечанасьці. Максымальная ўвага павінна быць аддана ўмацаваньню нізавога зьвяна, партыйных груп, калгасных ячэек, партыйна-камсамольскіх ядраў. Пры гэтым ня менш увагі трэба аддаць пытаньню выяўленьня і арганізаны калгаснага актыву. Адным словам, сапраўды па-дзелавому, практычна і канкрэтна навярнуцца тварам да калгаснай вытворчасьці, на справе ліквідаваць абжылічку, зьнішчыць элемэнты расхлябанасьці і недысцыплінаванасьці ў кіраўніцтве калгасамі.

Ужо зараз неабходна паказаць кожнаму калгасьніку, што ён атрымлівае на працадзень, пры гэтым шырока папулярызаваць параўнаньні каштоўнасьці працадня паміж калгасамі, дзе працавалі лепш і наадварот.

Зараз, у час уборкі ўраджая, справа заключаецца ня толькі ў тым, каб хутка ўбраць, але і ў тым, каб убраць **чыста, добраякасна, без малейшых страт** і здаць дзяржаве ня толькі ў тэрмін, але і **добраякаснае,** сыпелае, сухое і чыстае збожжа, мабілізуючы калгасьнікаў на самую бязьлітасную барацьбу супроць кулацкіх элемэнтаў, новых манэўраў кулака — злучыць добры ўраджай, убраць яго з стратамі, здаць дзяржаве горшае, а сябе ўзяць лепшае.

Бальшавікі Аршаншчыны маюць усе магчымасьці для таго, каб выканаць гэтыя задачы з гонарам, каб заняць адно з першых месц у БССР у правядзеньні гаспадарча-палітычных кампаній.

Р. Соскін
Сакратар Аршанскага РК КП(б)Б

БАЛЬШАВІКІ АРШАНШЧЫНЫ ў БАРАЦЬБЕ ЗА ЎБОРКУ і ЗБОЖЖАПАСТАЎКІ

Сельская гаспадарка Аршанскага раёну мае вялікую ўдзельную вагу ў БССР па вытворчасьці сельска-гаспадарчай прадукцыі. Пасеўная плошча раёну — 96.300 га. Толькі аднаго ярвога кліну Аршаншчына ў гэтым годзе засеяла звыш 70.000 га. У раёне 32 сельскіх саветы, у якіх налічваецца 293 калгасаў з агульнай пасеўнай плошчай 71.289 га.

Усё гэта дае магчымасьць бальшавікам Аршаншчыны заняць адно з першых месц у КП(б)Б па арганізацыйна-гаспадарчаму ўмацаваньню калгасаў, па ажыцьцяўленьню лёзунга тав. Сталіна — зрабіць калгасы бальшавіцкімі, а калгасьнікаў заможнымі.

Вопыт мінулых год і асабліва сёлетняй веснавой сяўбы паказаў, што наяўныя магчымасьці ў раёне не выкарыстоўваюцца. Аршаншчына не займала належнага месца сярод раёнаў БССР. Хіба не ганьбай для бальшавікоў Аршаншчыны зьяўляецца той факт, што веснавая сяўба ў раёне закончана з вялікім спазьненьнем, толькі 10-га чэрвеня, і пры тым з недасевам на 6 проц. аўсу.

Дрэнная работа раённага кіраўніцтва, наяўнасьць у партыйнай арганізацыі элемэнтаў расхлябанасьці і недысцыплінаванасьці,—вось у чым асноўныя прычыны адставаньня.

Толькі гэтым можна вытлумачыць тое, што рад «камуністаў», адказных работнікаў на вёсцы (Якаўлевіцкі сельсавет і іншыя) замест бальшавіцкай мабілізацыі мас на барацьбу супроць кулака, за пляны сяўбы, браллі пад сумненьне дырэктывы ЦК, адкрыта заяўлялі, што «пляны сяўбы складаюцца не для нас, а для Масквы» (Красоўскі, Белян і іншыя).

Партыйная арганізацыя раёну зусім невыстарчальна мабілізавала сябе на барацьбу з кулаком, з кулацка-дзедаўскімі традыцыямі позьняй сяўбы. У радзе зьвеньняў арганізацыі — у некаторых ячэйках, сельсаветах і нават раённых установах — была страчана клясавая пільнасьць.

У калгасе **«Чырвоная зьмена»** Тумінінскага сельсавету доўгі час арудваў кулак, якога ня гледзячы на сыгналы камсамольскай ячэйкі, кіраўніцтва сельсавету абараняла. І толькі пасьля таго, як аб гэтым даведаўся РК КП(б)Б, кулак быў выгнаны і калгас пачаў умацоўвацца.

А чаго варты такі факт: кантора Белсельгаспасаба, якая ў правядзеньні сельска-гаспадарчых кампаній адыгрывае вялікае значэньне, засьмечана клясава-варожымі элемэнтамі. Увесь яе апарат складаецца з кулакоў, папоўскіх і спэкулянцкіх элемэнтаў.

Чыстка партыі паказала, што ў раёне мела месца значная засьмечанасьць і паасобных зьвеньняў партыйнай арганізацыі. Так, напрыклад, у **Якаўлевіцкай** партыйнай ячэйцы з 19 камуністаў выключана з партыі 9.

У радзе вышадкаў, як з боку нізавых і савецкіх зьвеньняў, так і з боку некаторых раённых арганізацый да пушчалася права-«лявацкая» практыка, масавая работа сярод адпаасобнікаў падмянялася голым адміністраваньнем.

Вось асноўныя прычыны адставаньня Аршанскага раёну ў веснавой сяўбе. У тэлеграме т. Гікало, Цэнтральны Камітэт КП(б)Б паставіў перад намі выразную, баявую задачу — на аснове перабудовы па-новаму работы партыйных і савецкіх арганізацый, на аснове рашучай барацьбы з расхлябанасьцю, з недысцыплінаванымі элемэнтамі ў арганізацыі, на аснове рашучай барацьбы з кулаком і яго агентурай, забясьпечыць належны пералом у правядзеньні важнейшых гаспадарча-палітычных кампаній па Аршанскаму раёну.

Зараз ужо можна бачыць, што пачатак пералому ёсьць. У рэзультаце канкрэтнага кіраўніцтва і практычнай дапамогі з боку ЦК на чале з т. Гікало мы дабіліся наступных шаказальнікаў у правядзеньні летніх сельска-гаспадарчых работ:

— Зараз-жа пасьля атрыманьня тэлеграмы ЦК партарганізацыя раёну была мабілізавана на завяршэньне веснавой сяўбы. У выніку да 10-га чэрвеня плян пасеўнай быў выканан, а гэта значыць, што за апошнюю сямідзёнку было выканана 40 проц. пляну веснавой сяўбы;

— да 20-га чэрвеня гароднія культуры былі праполаты на 210 проц., тэхнічныя на 118 і збожжавыя па 175 проц.; 1-га ліпеня плян уздыму папараў быў поўнасьцю выканан, а на 15-е ліпеня — перавыкананы на 30 проц.;

— плян касьбы і ўборкі сена быў выканан на 20-VII на 100,04 проц.;

— на 12 жніўня плян здачы дзяржаве сена выканан на 91,8 проц., жыта было зжата на 97 проц.

Такім чынам па праполцы, уздыму папараў і сенаўборцы раён ужо заняў адно з першых месц у БССР.

Гэтыя рэзультаты нашай работы зьявіліся не ў парадку самацёка. Зараз-жа пасьля атрыманьня тэлеграмы т. **Гікало** мы правялі рад практычных мерапрыемстваў па ажыцьцяўленьні задач, пастаўленых перад намі ЦК.

Першае, за што мы ўзяліся, гэта расстаноўка сіл, мабілізацыя і згуртаваньне вакол ячэек і сельсаветаў беспартыйнага актыву, умацаваньне вясковых арганізацый за лік раённага актыву. Усё гэта праводзілася намі ў поўнай адпаведнасьці з рашэньнем ЦК аб палітаддзелах і перабудове работы вясковых партарганізацый. За апошні час намі накіравана ў калгасы ў якасьці старшыень і брыгадзіраў па пастаянную работу 25 камуністаў з раёну і 7 з тэрытарыяльных ячэек. Акрамя таго, з ліку райпартактыву на пастаянную работу ў сельсаветы, каапэрацыю накіравана 14 камуністаў, і яшчэ ў якасьці парторгаў у калгасныя брыгады накіравана з раёну 85 членаў і кандыдатаў партыі, а з тэрытарыяльных ячэек 57.

Партыйная арганізацыя правяла і праводзіць рашучую барацьбу з элемэнтамі расхлябанасьці і недысцыплінаванасьці. За апошні час зьняты з работы і выключаны з партыі рад адказных сельскіх работнікаў, якія выпадкова трапілі ў партыю, папалі пад уплыў клясавага ворага, перарадзіліся.

У мэтах мабілізацыі калгаснага актыву на пасьпяховае выкананьне гаспадарча - палітычных задач па вёсцы намі праведзены: раённы зьлёт калгасьнікаў-ударнікаў, зьлёт жанчын калгасьніц, раённая парада вопытнікаў, сельсавецкія зьлёты калгасьнікаў-ударнікаў і г. д.

Акрамя таго, мы зараз практыкуем сыстэматычную таварыскую перапіску са старшынямі калгасаў і членамі сельскіх саветаў. У гэтых таварыскіх лістох, улічваючы канкрэтныя ўмовы таго ці іншага калгасу або сельсавету, раённыя кіруючыя работнікі даюць паказаньні, робяць практычныя парады.

Надзвычай вялікую ролю ў мабілізацыі калгасных мас і працоўных адпаасобнікаў на барацьбу за тэмпы і якасьць сельска-гаспадарчых работ, асабліва па ўборцы і збожжапастаўках адыгралі ў нашым раёне чыстка партыі і палітаддзел. У адзнаку чысткі рад калгасаў правільна арганізаваў у сябе працу, датэрмінова закончыў сенаўборку і г. д. Калгасы зоны МТС першымі пачалі ўборку збожжа і здачу яго дзяржаве.

Правядзеньне праполкі, уздыму папараў і сенаўборкі выразна паказала, што Аршанскі раён мае ўсе магчымасьці быць адным з перадавых раёнаў БССР. Некаторыя посьпехі ўжо ёсьць. Аднак, і

ЦІХААКІЯНСКІЯ СПРАВЫ

ЯПОНА-ФРАНЦУСКІЯ СПРЭЧКІ ЗА КАРАЛАВЫЯ АСТРАВЫ

ТОКІО, 18. (Белта). Усе токійскія газэты ўказваюць, што японскі ўрад у бліжэйшыя дні паведамліць французскі ўрад аб тым, што Японія ня можа прызнаць акупацыі Францыяй астравоў у Паўдзёва-Кітайскім моры з тэй сэрэдыны, што японскія фірмы маюць жаёмасныя інтарэсы на гэтых астравох. Разам з тым японскі ўрад, паводле цьвярджэньняў газэт, запэўніць французскі ўрад, што Японія ня мае намору ісьці далей ужыцьця дыпляматычных сродкаў, у прыватнасьці не пашле ваенных суднаў для захопу астравоў.

Зьнішчальнікі ПАЗШ-ля берагоў Манчжоў-Го

ТОКІО. 18 (Белта) Агэнцтва «Кокумін» паведамляе, што морскія ўлады **Порт-Артура** заняты расьсьледваньнем прычын зьяўленьня некалькіх амэрыканскіх зьнішчальнікаў у тэрытарыяльных водах кваньтунскай вобласьці ў ноч на 17 жніўня. Паводле папярэдніх даных, амэрыканскія зьнішчальнікі правялі некалькі гадзін у раёне двух астравоў, якія маюць, як сьцьвярджаюць морскія ўлады, вялікае значэньне для абароны Манчжоў-Го і знаходзяцца ў эсэ, забароненай для навігацыі.

Амэрыканскія пляны апанаваньня азіяцкімі рынкамі

НЮ-ЁРК, 17 (Белта). У кіруючых колах ПАЗШ узмацняюцца тэндэнцыі да шырскага разьвіцьця экспарту на азіяцкія рынкі. Агэнцтва АСАШЫЭЙТЭД ПРЭС» паведамляе з Вашынгтону, што сельска-гаспадарчае ведамства скліча на 21 жніўня ў ПОРТЛЭНДЗЕ (штат Арэгон) канфэрэнцыю для абмеркаваньня пляну збыту пшаніцы ў краіны Далёкага Ўсходу. Збыт гэты будзе праводзіцца на аснове дэмпінгавых цэн. Адначасова «Н'Ю-ЁРК ТАЙМС» паведамляе, што нафтавыя кампаніі «Сокопон Вакум Карпарэйшэн» і «Стандарт Ойл Оф Нью-Джэрсі» дагаварыліся аб аб'яднаньні іх нафтаперагонных заводаў у краінах Далёкага Ўсходу, з мэтаю рацыяналізаваць збыт нафтапрадуктаў на азіяцкіх рынках.

Пабіцьцё штурмавікамі супрацоўніка гандлёвага прадстаўніцтва СССР у Бэрліне

БЭРЛІН, 18 (ТАСС). 17 жніўня два штурмавікі зьбілі супрацоўніка гандлёвага прадстаўніцтва СССР савецкага грамадзяніна ГРЫШЫНА за тое, што ён ня вітаў праходзіўшую штурмавую калёну.

Даведаўшыся, што ГРЫШЫН чужаземец, зьбіваўшыя яго штурмавікі ўцяклі і вярнуліся ў калёну. Паліцэйскі да якога зьвярнуўся Грышын за абаронай заявіў, што Грышын павінен прывесьці да яго тых асоб, якія зьбівалі яго. На заўвагу Грышына, што штурмавікі вярнуліся ў калёну, паліцыянт адказаў, што нічога ня можа зрабіць. Гандлёвае прадстаўніцтва перадало міністэрству замежных спраў пратэст.

„Японія і Германія маюць сёньня агульныя задачы"

БЭРЛІН, 19. (БЕЛТА). У гутарцы з супрацоўнікам нацыянал-сацыялісцкай «Гензэраль анцэйгер», японскі пасол у Бэрліне НАГАІ заявіў, што ў Японіі панує спрыяльны настрой у адносінах да «нацыянальнай Германіі». Ён падкрэсьліў далей, што палітычныя інтарэсы Германіі і Японіі ня стыкаюцца. Ногаі выказаў упэўненасьць, што з боку Германіі будзе праяўлена «разуменьне таго фанту» што ўмацаваньне Японіі ва Ўсходняй Азіі як у палітычных, так і ў гаспадарчых адносінах павінна быць прызнана ўсім сьветам».

У камэнтарах да інтэрв'ю, газэта ўказвае на «падабенства ў гістарычным разьвіцьці Японіі і Германіі». «Прусія і Германія шмат у чым сталі для Японіі ўзорам,—піша газэта. Бяз сумненьня, Японія і Германія сёньня маюць ва многіх адносінах агульныя задачы».

ПРАВІЛЫ „АРГАНІЗАВАНАГА РАЗМНАЖЭНЬНЯ АРЫЙЦАЎ"

У ваатэхніцы ёсьць правіла, што пры гадаваньні племянной жывёлы, патрабен старанны падбор самца і самкі. І гэта правіла ўжываецца на жывёлагадоўчых фермах. Але ніяк нікому ня прыходзіла да гэтага часу ў галаву ўжываць гэта правіла да людзей. Людзі размнажаліся неарганізавана. Мужчыне і жанчыне прадстаўляецца поўная свабода выбару таварыша ў жыцьці.

Аднак, германскія фашысты, захопленыя расавым шалёнствам, нарэшце пакласьці канец такому неарганізаванаму размнажэньню людзкой пароды «Германская раса—мяркуюць яны,—вышэйшая за ўсе іншыя расы на сьвеце. А таму трэба спыніць усякае засьмечаньне арыйцаў іншымі «нягоднымі» расамі».

І вось, германскі журнал «Народная навука» друкуе падрабязную інструкцыю аб шлюбе і скрыжаваньні паасобных рас.

«Расы і жанчын нельга пакідаць самім сабе—піша журнал. Арыйка чыстай расы павінна знайсьці абарону і дапаўненьне сваёй вартасьці ў мужу чыстай расы. Для гэтага патрабуем, каб кожны германец чыстай расы, блакітнавокі блёндын, высокага ўзросту, моцна збудаваны ажаніўся толькі з блёндынкай, якая мае блакітныя вочы, авальны падоўжаны твар з ружова-белай скурай, малымі вуснамі, вузкім носам і чякая, бязумоўна, павінна быць дзяўчынай. Ужо стара-германскае заканадаўства ставіла вышэй шлюб з дзяўчынамі, чым шлюб з. удовамі. Не гаворым тут аб разьведзеных, бо такога роду жанчын заканадаўства наогул прадугледжваць ня можа.

Патрабуем яшчэ—піша далей журнал—выданьня распараджэньня аб забароне расавым германцам жаніцьбы з брунеткамі, якія маюць арліны нос, поўныя губы. Вялікі зарост на целе і схільнасьць да паўнаты. Жанчыны з такім выглядам належаць да міжземнаморскага тыпу, які зьяўляецца нізкім тыпам распусты. Таксама падобны выгляд жанчыны якая мае ў дадатак карэнскія ногі, становіць тып напрыцянскі, які акрэсьлівае жанчыну — рабочую жывёлу. Апрача таго, расавы германец, творац германскай расы, не павінен ажаніцца з дзяўчынай, якая любіць забавы, спорт і падоўгу ня бывае ў хаце».

Як бачым, інструкцыя даволі падрабязная.

Аднак, германцы, хоць і чыста арыйскай расы, ніяк ня хочуць падпарадкавацца правілам «арганізаванага размнажэньня». Асабліва жанчыны. Шпацыруюць сабе з яўрэямі і іншымі неарыйцамі! І што-ж тут з імі зрабіць?

Але-ж навошта ёсьць галава ў гітлераўцоў? Яны і тут знайшлі раду, і вельмі простую: як толькі штурмавікі заўважаюць якую-небудзь арыйку разам з яўрэем, яны просяць у яе дакуманты, запісваюць прозьвішча і на другі дзень фашыцкія газэты друкуюць «чорны сьпіс» арыяк, якія не падпарадкоўваюць правілам «арганізаванага размнажэньня».

Але арыйкі аказваюцца ўпартымі. Не баяцца і гэтых чорных сьпісаў. Справа дайшла нават да таго, што, як піша «Гесішэ фолькскмахт», у Лейпцыгу (дзе ў кожным готэлі і рэстаране вісяць таблічкі з надпісам: «Германская жанчына не танцуе з яўрэем»), штурмавікі арыштавалі шмат арыяк, якія разам з яўрэямі рабілі экскурсію і начавалі ў готэлях для турыстаў.

Упартыя гэтыя арыйкі! Ніяк ня хочуць гадаваць толькі арыйцаў чыстай расы.

Гігант авіяцыі імя гігانта літаратуры

АНТ-20 „Максім Горкі"



Андрэй Нікалаевіч Тупалеў... Хто цяпер ня ведае гэтага імя? Скарочана гэта будзе яшчэ прасьцей: АНТ. А. Н. Тупалеў — адзін з выдатнейшых савецкіх інжынэраў-канструктароў, надзвычайны энтузіяст савецкага самалётабудаўніцтва. У 1925 г. зьявіўся ў паветры яго першае дзецішча — АНТ-1. На працягу яшчэ і васьмі год, а зараз ужо Цэнтральны аэрадынамічны інстытут у Маскве (ЦАГІ) будуе флагманскі карабль агітэскадрыльлі імя М. Горкага, самалёт-гігант «Максім Горкі». «Максім Горкі» будзе вялізарнейшым у сьвеце сухаземным самалётам. Як пасажырскі самалёт, ён зможа падняць у сваіх каютах і салёне, разьмешчаных усьцяж фюзэляжу і ўнутры крыльляў, 70-75 чалавек, прадаставіўшы ім усе выгады: спальныя месцы, гарачую страву і г. д.

Асноўнае назначэньне АНТ-20 — быць крылатым агітатарам па ўсім Саюзе ССР. Гэтай умове падпарадкавана ўсё абсталяваньне будуемага паветранага гігانта, які ня мае роўнага сабе ў сьвеце. Восем матораў «Максіма Горкага» падымуць усё необходнае для масавай работы ў агітрэйсах: кіно, фотаапараторы з здымачным і праекцыйным апаратамі, радыёабсталяваньне, у тым ліку прыёмную і перадатачную станцыі, гіганцкія рупары (пад крыльлямі), тэлевізыйную ўстаноўку, сьветлатэхніку, у тым ліку ўстаноўку для праектаваньня пёзунгаў на небе, матацыкль.

Аэранавігацыйныя прыпады, у тым ліку «аўтаматычны пілёт», будуць на самалёце апошнім дасягненьнем тэхнікі. Устанаўляецца тэлефон, пнэўматычная пошта і цэнтраэлектрацэнтраль. Апроч таго, на самалёце будзе абсталявана паходная друкарня пёгкага тыпу. Уся гэта складаная тэхнічная гаспадарка паветранага гігانта будзе абслугоўвацца магутнай цэнтральнай электрастанцыяй. Усё яго абсталяваньне, як і сам самалёт, будуецца цалкам з савецкіх матар'ялаў, па савецкіх канструкцыях і рукамі савецкіх спэцыялістаў.

1-га МАЯ 1934 ГОДУ САМАЛЁТ БУДЗЕ РЭЯЦЬ НАД МАСКВОЙ.

Шалёнства германскіх фашыстаў

ЛЁНДАН, 19. (Белта). Брэслаўскі карэспандэнт «МАНЧЭСТЭР ГАРДЫЯН» паведамляе, што «што ні адзін мала-мальскі ўплывовы чалавек, хоць бы толькі на сваёй вуліцы, не знаходзіцца ў бясьпечнасьці. Досыць мадэшага падазрэньня, досыць імя, ці адрасу, вырванага з дапамогаю катаваньняў у якога-небудзь арыштаванага ў адным з «карычневых дамоў», як тэрыстычная група захоплівае новую ахвяру.

У кожным «карычневым доме» засядае «трыбунал» з 3-х чалавек. Напагатове заўсёды ёсьць спэцыяльная «каманда па біцьці» прылада зьбіваньня —або бізун, або абвернутая мокрай анучкай гумавая дубінка. Зьбітых 2.000 чалавек. Часам катаваньні вар'юцца. Так, аднаго 52-гадовага рабочага прымусілі палажыць рукі на край стала, а тэрарысты моцна трымалі яго. Затым яго сталі біць бізуном па пальцах, пакуль яны ня былі зламаны і расьцяснуты».

***

ВАРШАВА, 18 (Белта). Па даных «Работніка» (орган ППС) за апошнія два тыдні надзвычайны суд у Браўншвэйгу вынес 14 сьмяротных і 135 катаржных прыгавароў—усяго на 840 год турмы і 130 год катаргі.

«Фалькішэр бэобахтэр» піша: «Рост камуністычнай прапаганды ў апошнія дні і ўзмацненьня дзейнасьці чырвоных агітатараў прымусілі ўчора бэрлінскі суд павысіць меры пакараньня». Газэта прыводзіць словы старшыні суда, які заявіў: «Пачынаючы з сёньняшняга дня, як мінімум пакараньня будзе ўстанаўляцца адзін год турэмнага зьняволеньня».

Польскі друк аб зьнешняй палітыцы Германіі

ВАРШАВА, 17 (Белта). Блізкая да ўраду «Кур'ер Поранны», спыняючыся на германскай палітыцы, заяўляе, што Германія выступае са словамі аб міры для зьнешняга сьвету, а ўнутры, у сябе, і ўдзень і ўночы вострыць меч вайны.

У такім-жа духу піша таксама «Газэта Варшаўска». «Калі Гітлер—заяўляе газэта—сёньня дэманструе свае імкненьні да міру і шчыра намерам урэгуляваць адносіны з Польшчай, калі з ім і яго людзьмі лягчэй дагаварыцца, чым з прадстаўнікамі іншых германскіх партый, дык тут няма ніякай супярэчнасьці. Палітыка Гітлера —ясная і простая: германскія пляны па Ўсходзе могуць быць рэалізаваны толькі ў той момант, калі Германія будзе досыць моцнаю... Германія зараз мае патрэбу ў міры, каб ўнутрана замацнець і падрыхтаваць глебу на міжнароднай арэне. Мірная палітыка разьлічана на бягучы момант, ваенныя намеры—на будучае. Гэтым і тлумачыцца тая акалічнасьць, што германская палітыка ў адносінах да Польшчы мае два твары, з іх адзін прызначан для зьнешняга сьвету». Газэта прыходзіць да таго выводу, што Польшча павінна ўстанавіць мірнае сужыцьцё з Германіяй, не забываючы аднак, што «ў бутучым справа немінуча дойдзе да генэральнай бойкі з Германіяй, да якой Польшча павінна падрыхтавацца як матар'яльна, так і псыхалёгічна».

Лідэры II Інтэрнацыяналу адкрыта адмаўляюцца ад вучэньня К. Маркса

ВЕНА, 18 (Белта). У сувязі з маючай быць 21 жніўня ў Парыжы канфэрэнцыяй другога Інтэрнацыяналу, у лягеры сацыял-фашызму адбывецца жвавая дыскусія, выкліканая ўзмоцненым працэсам разлажэньня партый другога Інтэрнацыяналу ў рэзультаце банкруцтва яго асноўнай апоры—германскай сацыял-дэмакратычнай партыі.

Найбольш характэрнымі ў дыскусіі зьяўляюцца адкрытыя заявы лідэраў другога Інтэрнацыяналу аб НЕАБХОДНАСЬЦІ АДМОВІЦЦА АД АСНОЎНЫХ ПРЫНЦЫПАЎ ВУЧЭНЬНЯ К. МАРКСА АБ КЛЯСАВАЙ БАРАЦЬБЕ. Адначасова КАУЦКІ, ВАНДЭРВЭЛЬДЭ і ОТТО БАЎЭР у адзін голас салідарызуюцца з палітыкай германскай сацыял-дэмакратыі, якая расчысьціла дарогу фашызму ў Германіі. Усе яны адкідаюць ўсякую думку аб барацьбе супроць фашызму. Каўцкі ў артыкуле «Крывавая рэвалюцыя», зьмешчаным у органе аўстра-марксыстаў «КАМПФ» піша, што «ў параўнаньні з грамадзянскай вайной, якая зьяўляецца «найбольш жахлівай формай вайны» імпэрыялістычная вайна становіць сабою найбольш гуманную форму вайны».

З другога боку асобныя эмігравуўшыя лідэры германскай сацыял-дэмакратыі абмяняўшыся ролямі з Отто Баўэрам, выступаюць з «левымі» фразамі аб тактыцы сацыял-дэмакратыі, запазычанымі ў аўстра-марксыстаў.

Французкі друк аб аўстра-германскіх адносінах

ПАРЫЖ, 18 (БЕЛТА) Абмяркоўваючы пытаньне аб аўстра-германскіх адносінах, «Тан» у перадавым артыкуле піша, што Францыя цьвёрда параніла прынцыпы міжнароднага права.

«Цярплівасьці прыходзіць канец і наступіць момант, калі прыдзецца дзейнічаць і дзейнічаць энэргічна». Газэта раіць нацыянал-сацыялісцкаму ўраду ўлічыць, што ў выпадку перадачы справы ў Лігу нацый, Германія бязумоўна будзе асуджана і што міжнародная грамадзкая думка схіляецца да ўжыцьця санкцыі супроць Германіі.

Бэрлінскі карэспандэнт «Пары Суар» піша, што ў Бэрліне лічацца з магчымасьцю разрыву дыпляматычных адносін з Аўстрыяй, калі цяперашняе становішча будзе працягвацца.

Рост колькасьці бяспрытульных і у ПАЗШ

НЮ-ЁРК, 18 (Белта). «Н'Ю-ЁРК ТАЙМС» адзначае значны рост дзіцячай бяспрытульнасьці ў ПАЗШ. Праз адзін толькі горад Дзюмузн (галоўны горад штату Айлова) штодзень праяжджае на крышах таварных вагонаў ад 400 да 500 дзяцей. Галоўная маса іх накіроўваецца ў пшанічныя раёны ПАЗШ, дзе яны спадзяюцца знайсьці работу ў часе ўборачнага сэзону.

Заняпад гаспадарчага жыцьця Польшчы

Гаспадарчае жыцьцё Польшчы знаходзіцца ў катастрафічным становішчы. Эканамічны крызіс параліжуе ўсе галіны польскай прамысловасьці. Гэтымі днямі «Ведамосьці статыстычнэ» даюць характэрны малюнак пагаршэньня гаспадарчага жыцьця, сустакаўляючы 1930-31-32 г. г. да канца мая 1933 году.

«Роботнік» піша: «Гэта ня будзе вясёлым малюнкам, але затое ён дасьць нам прыблізнае паняцьце аб нашай рэчаіснасьці. Здабыча вугалю з кожным годам катастрафічна зьмяншаецца. Калі ў 1930 годзе здабыча складала 37 млн. тон, у 1931 г. — 38 млн. тон, то ў 1932 г.—каля 28 млн. тон. Як бачым, здабыча вугалю за адзін год зьменшылася на 10 млн. тон. 1933 год паказвае далейшае зьмяншэньне здабычы вугалю. За 5 месяцаў 1933 году здабыта 10,2 млн. тон, што за год будзе складаць каля 24,5 млн. тон. Параўнальна з 1931 годам, у 1933 годзе будзе здабыта вугалю менш на 14 млн. тон, або на 37 проц.

Бязупынна зьмяншаецца вываз вугалю заграніцу. Калі ў 1930 годзе было вывезена на 335 млн. злотых, у 1931 годзе на 339 млн. зл., то ў 1932 годзе на 120 млн. злотых, а за першую палову 1933 г. толькі на суму каля 74 млн. злотых, што за год складае каля 148 млн. злотых. Параўнальна з 1931 годам, вываз вугалю заграніцу ў 1933 годзе будзе складаць розьніцу на 191 млн. злотых, або 56 проц.

Катастрафічна зьмяншаецца спажываньне вугалю ўнутры краіны. Калі ў 1930 г. было скарыстана 11,4 млн. тон, у 1931 г. — 9,7 млн. тон., у 1932 — 7,5 млн. т., то па прадыту 5 месяцаў 1933 г. — толькі 2,9 млн. тон. Такім чынам, спажываньне вугалю складзе 7 млн. тон у год. Зьмяншэньне спажываньня вугалю ўнутры краіны, параўнальна з 1931 годам складае 4,4 млн. тон, або 40 проц.

Нафты ў 1930 г. здабыта 663 тыс. тон, у 1932 г.—557 тыс. тон. У 1933 годзе ідзе далейшае зьніжэньне. Здабыча жалеза і сталі ў 1930 годзе складала 1,7 млн. тон, у 1931 г.—1,3 млн. тон, у 1932 г. — 0,7 млн. т. Як бачым, здабыча жалеза і сталі зьменшылася на 1 млн. тон, ці 59 проц. За 5 месяцаў 1933 году здабыта 445 тыс. тон, што ў год складае каля 1 млн. тон.

Зьмяншаецца здабыча цэманту. У 1930 годзе здабыта 832 тыс. т., у 1932 — 365 тыс. тон, а ў 1933 годзе за 5 месяцаў толькі 73.000 тон. Цэмантная прамысловасьць параўнальна з 1931 годам скарацілася ў 6 раз. Спажываньне электраэнэргіі зьменшылася з 2.670 млн. кілёват-гадзін у 1930 годзе да 2.066 млн. у 1932 годзе. Яшчэ больш зруваецца спажываньне энэргіі ў 1933 г.

Што датычыць росту беспрацоўя, то хоць статыстычныя даныя не даюць поўнага малюнку, бо ня ўсе беспрацоўныя шукаюць работы праз біржу працы, аднак, можна гаварыць аб бязупынным катастрафічным росьце беспрацоўя. Калі ў 1930 г. у горнай прамысловасьці працавала 667.000 рабочых, то ў маі 1933 году толькі 471 тыс. Такім чынам, за тры гады страцілі працу 216.000. Але-ж і з тых рабочых, якія яшчэ працуюць, толькі 213 тыс. працуе цэлы тыдзень, а астатнія (55 проц.) працуюць па 2-3 дні ў тыдзень. Калі ў 1930 г. працавала ў сярэднім 18,9 млн. гадз. у тыдзень, то ў маі 1933 г. — толькі 13 млн.

Яркі малюнак аб беспрацоўі дае страхаваньне рабочых у больнічных касах. Калі ў 1930 г. было застрахавана 2.436 тыс. чал., то ў красавіку 1933 г. —2.033 тыс. З гэтага вынікае, што лік беспрацоўных за тры гады ўзрос на 400.000 чалавек, апрача сялян, якія не зьяўляюцца членамі больнічных кас.

«Ня будзе памылкай, — піша «Роботнік», — сказаць, што ў Польшчы зараз **тры чвэрткі мільёну беспрацоўных, бо колькасьць беспрацоўных знач на перавышае колькасьць рабочых, маючых яшчэ працу».**

Заграніччны гандаль Польшчы таксама скарачаецца з году ў год. У 1930 годзе было вывезена тавараў на 2.443 млн. злотых, а ў першую палову 1933 году толькі на 435 млн. зл., што за год складае каля 870 млн. злотых ці 36 процантаў параўнальна з 1930 г. Увезена тавараў у 1930 г. на 2.246 млн. зл., а за 6 месяцаў 1933 г. толькі на 337 млн. зл., што складае параўнальна з 1930 г. — 33 проц.

Зьменшылася перавозка тавараў па чыгунцы. Калі ў 1930 годзе перавезена 61 млн. т., то ў 1932 годзе — 44 млн. тон, а ў 1933 г. будзе перавезена толькі 35 млн. т. Таксама зьменшылася перавозка пасажыраў. Калі ў 1930 годзе было перавезена 153 млн. чал., у 1932 г. 112 млн. чал., то ў 1933 г. будзе перавезена каля 90 млн. чал.

Зварот грошай у 1930 г. складаў 1.569 млн. злотых, а ў чэрвені 1933 г. —1.330 млн. злотых. **Запас золата ў польскім банку зьменшыўся з 562 млн. злотых да 473 млн. зл.;** вэксалі, якія павінны быць уплочаны заграніцай з 413 млн. — да 80 млн. злотых.

Зварот чэкаў у ашчадкасе скарацілся з 23 млн. да 21 млн. злотых у 1932 годзе. Паштовых пераводаў пераслана ў 1931 г. на 487 млн. злотых, а ў 1933 г., калі меркаваць па паўгодзьдзі, толькі на 300 млн. злотых. Сума пазык, выданых праз польскія дзяржаўныя і прыватныя банкі ў 1930 г. складала 1.801 млн. злотых, а ў 1933 г. — толькі 1.295 млн. злотых. Уклады ў банкі зьменшыліся за гэты час з 1.442 млн. да 901 млн. злотых.

ЦК КП(б)Б—т. Гікало, ЦВК БССР—т. Чарвякову, СНК БССР—т. Галадзеду, ЦС Асоавіяхіму БССР—тав. Дубіне, рэдакцыі газэты „Зьвязда" і „Рабочай"

РАПАРТ

Праўленьне Беларускага саюзу каапэрацыі інвалідаў рапартуе, што дадзенае абяцаньне III пленуму Асоавіяхіму БССР і тав. **Эйдзману** — пабудаваць баявы самалёт у 1933 г.—чырвонымі партызанамі, інвалідамі вайны і працы, працуючымі ў арцелях каапэрацыі інвалідаў БССР, з гонарам выканана. Да дня авіяцыі—18 жніўня Цэнтральнаму Савету Асоавіяхіму БССР пераведзена 40.000 рубл. для пабудовы баявога самалёту імя «каапэрацыі чырвоных інвалідаў БССР».

Апрача гэтага па нашай сыстэме сабрана ў фонд пабудовы эскадрыльлі імя тав. КАГАНОВІЧА 12.000 руб., што складае аднадзенны заработак.

Няхай жыве і мацнее авіяцыя СССР!

ПРАЎЛЕНЬНЕ БЕЛКААПСАЮЗУ.

***

УНОСЯЦЬ І ВЫКЛІКАЮЦЬ.

Да дня авіяцыі Магілёўскі раён сабраў на пабудову эскадрыльлі імя тав. Кагановіча 26.119 руб., з якіх ужо пераведзена на бягучы рахунак 6.137 руб. Астатнюю суму абавязуемся ў бліжэйшыя дні перавесьці таксама.

Камінскі.

КРАСНОЎ Г. А.

16 жніўня г. г. за работай заўчасна раптоўна памёр адзін з старых работнікаў пралетарскай юстыцыі, памочнік транспартнага пракурора тав. КРАСНОЎ Г. А.

Тав. КРАСНОЎ—вытрыманы бальшавік, самаадданы чэсны работнік, адзін з лепшых ударнікаў, актыўны рабкор і грамадзкі працаўнік, чырвоны партызан, выключна скромны і добры таварыш, літаральна,—згараў на рабоце.

За 37 год свайго жыцьця тав. КРАСНОЎ прайшоў слаўны шлях бальшавіка. Пачынаючы з Кастрычніцкай рэвалюцыі тав. КРАСНОЎ самаадданa, не шкадуючы жыцьця, змагаецца за пралетарскую дыктатуру са зброяй у руках, ліквідуючы белагвардзейскія і бандыцкія шайкі ў Смаленшчыне. У часе падаўленьня Кранштадзкага мяцежа тав. КРАСНОЎ па заклику X зьезду УсеКП(б) пайшоў у першых радох байцоў, ліквідаваўшых генэральскую зграю.

Работнік і кіраўнік сьледчых камісій, сьледчы, член Губрэвтрыбуналу, сьледчы па важнейшых справах, пам. пракурора—вось усе работы КРАСНОВА пасьля рэвалюцыі.

Не шкадуючы жыцьця, хворы сардэчнай хваробай пасьля некалькіх раненьняў, кантузіі пад Кранштадтам, КРАСНОЎ змагаўся за справу рэвалюцыйнай законнасьці. Перагружаны работай, ён знаходзіў час для аўладаньня марксыцка-ленінскай тэорыяй, займаючыся ў вячэрнім інстытуце савецкага права.

Прашчай, прыяцель і таварыш!

Ударнай і прыкладнай работай, шчыльней згуртаваўшы свае рады, пад кіраўніцтвам УсеКП(б) і яе ленінскага ЦК мы будзем змагацца за справу сацыялістычнай законнасьці, за справу пабудовы сацыялістычнага бясклясавага грамадзтва.

КУЗЬМІН, ЛІПСКІ, ГЛЕЗЕРАЎ, МЕЛЬНІКАЎ, ПРОЦКІ, ГАЛАСКОК, АНДРЭЙЧЫК, КРЫЛОЎ, АПРЭЛЕЎ, ТРЭСКУНОЎ.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

ДЯРЖЦЫРК —ШАПІТО. ГАРАДЗКІ САД

Сёньня і штодзённа ТОЛЬКІ 2 ГАСТРОЛІ

чалавека-падобнай МАЛПЫ ТЭКО 1-шы

ТЭКО на пагулянцы. Тэко ў рэстаране. Малпа Тэко робіць усё, што робіць чалавек Тэко працуе.

Тэко —дома

Апошнія гастролі популярнага артыста рэспублікі Леаніда ІВАНАВА з яго новай групай дрэсіраваных жывёлін

ДАЖЫРАЎ і ГУРСКІ ў новым рэпэртуары паліткатыра, зводка дня.

ЛЕО РУЖАНСКІ арыгінальны номік-экспромпціст.

ВЯСЁЛЫЯ НАЧАДГАРЫ—маракі

4—ДЖЫОВАНІ 4 Паветраны палёт.

ПАЎЛЬТОН І ДАЛЁЙ вэлё-фігурысты.

Дрэсіроўшчыца германскага цырку Маргарыта БАРУМ зебры, ламы, пэны, якія, драмадзеры вялікая група дрэсіраваных коней і яшчэ шмат нумароў цыркавога жэшру.

ПАЧАТАК у 9 гадзін вечара.

Беларускі дзяржаўны тэатр оперы і балету (будынак БДТ-1)

СЁНЬНЯ

„Яўгені Анегін"

Лірычныя сцэны. Пастаноўка рэж. Вольгі Барысевіч, муз. Чайкоўскага.

Пачатак у 9 гадз. вечара:

Білеты прадаюцца ў рабочай касе штодзённа ад 12 да 2-х і ад 4-х да 6 гадз. веч., а 9 касе тэатру ад 12 да 2-х і ад 2-х да 5 гадз. веч.

Гукавы кіно-тэатр „Чырвоная Зорка" 2-ая і апошняя серыя ДЗЯЎЧЫНА Ў ДЖУНГЛЯХ замежны-прыгодніцкі фільм у 2-х серыях 14 частках:

Кіно „Інтэрнацыянал" Замежны мастацкі фільм МАХАНЬНЕ ТАМАЗЗТЫ (цёмныя сілы) драма ў 8-мі частках.

„ПРАЛЕТАРЫ" Пачатак 1-га сэансу ў 6 гадз. веч. Мажэхін і Лісэнка у фільме „АЙЦЕЦ СЕРГІ"

ДЗІЦЯЧЫ ГУКАВЫ кіно-тэатр Пачатак у 2 гадз. Новы экзэмпляр „ХАЦІНА ДЯДЗЬКІ ТОМА" у 6 частках.

Кіно „СПАРТАК" Замежны фільм „НЕ ЗАБЫВАЙ" драма ў 6 частках.

МЕНСКІ ГІДРАТЭХНІКУМ АБВЯШЧАЕ НАБОР СТУДЭНТАЎ на наступныя аддзяленьні:

мэліярацыйнае— 60 асоб, якое рыхтуе тэхнікаў мэліяратараў,

водазабеспячэньня— 30 асоб, рыхтуе тэхнікаў па водазабеспячэньні для сацыялістычнай сельскай гаспадаркі; вячэрняе аддз. без адрыву ад вытворчасці—30 асоб.

Правілы прыёму абвешчаны ў газ. „Зьвязда", 24-га ліпеня.

Заявы прымаюцца да 1-га верасьня.

Аб часе іспытаў будзе павядомлена кожнаму па яго адрасе.

Заявы накіроўваць: г. Менск, Дрэва-апрадоўчая, 59-17.

дырэкцыя.

Даводзіцца да ведама студэнтаў ВКСГШ Бел., што ЗАНЯТКІ пачынаюцца з 1-га ВЕРАСЬНЯ г. г.

Згодна пастановы сакратарыяту ЦК КП(б)Б, ад 17 жніўня ўсе студэнты, на бліжэйшыя на ўборачна-нарыхтоўчую кампанію, тэрміновa адкліканыя з гэтай работы і да 1 верасьня нарыхтаюць ка адпачынкам. На заняткі студэнты павінны зьявіцца 30 жніўня.

дырэкцыя.

Лужасьнянскі дзяржаўны Ільнаводны с.-г. тэхнікум абвяшчае АСЕНЬНІ НАБОР студэнтаў на 1 курс.

Іспыты—з 20 жніўня па 1 верасьня. Пачатак заняткаў з 1 верасьня. Усе паступаючыя трымаюць іспыты ў аб'ёме 7 груп па дысцыплінах: беларуская, грамадазнаўства, матэматыцы, фізыцы і хіміі.

Да заявы дадаць дакументы ў арыгіналах: аб адукацыі, сацстаноўшчы, здароўі, засьведчаная анкета, дзьве фота-карткі і пэштовых марак на 40 капп. Стыпэндыя па пасьпяховасьці. Інтэрнатам забясьпечваюцца ўсе. Пры тэхнікуме ёсьць сталоўка.

Адрас: г. Віцебск, Лужасьнянскі с.-г. тэхнікум. дырэкцыя.

Аршанскі рабочы факультэт паведамляе, што ПРЫЁМ ЗАЯЎ працягнут да 25 жніўня г. г.

Прыём заяў праводзіцца на ўсе курсы дзённага і вячэрняга рабфаку, з адукацыяй 4-х груп самігодкі, а скончыўшыя больш 4-х груп прымаюцца на старэйшы курс рабфаку.

Да заявы неабходна дадаць наступныя дакументы: матрыкулу, засьведчаную анкету, даведку аб сацыяльным і матар'яльным становішчы бацькоў, аб здароўі, аб адносінах да вайсковай павінасьці, аб адукацыі, дзьве фотакарткі і пэштовых марак на 40 капп. (для іншагародніх).

Прынятыя на дзённае аддзяленьне не забясьпечваюцца інтэрнатам, стыпэндыяй, падручнікамі і інш.

Прыёмныя іспыты пачнуцца—20 жніўня, а заняткі з 1-га верасьня.

Канцылярыя адкрыта штодзённа з 10 да 2 гадзін дня і з 6 да 8 гадзін вечара.

Увага: рабфак прымацован да горацкага інстытуту, які мае 7 факультэтаў, рыхтуючых спэцыялістаў высокай кваліфікацыі.

дырэкцыя.

НКПТ СССР „БУРВОДТРЭСТ"

Гомельскае аддзяленьне па БССР і Заходняй вобласьці Усесаюзнага дзяржаўнага буравога трэсту

ПРЫМАЕ ЗАЯЎКІ на III—IV кварталы 1933 г. на БУРЭНЬНЕ АРТЭЗЫЯНСКІХ СТУДНЯЎ.

У заяўках неабходна ўказваць наступнае:

1. Адрас работ (чыг. ст. і адлегласьць ад яе да месца работы).

2. Патрабуемая часовая продукцыя нясьць артэзыдравіны.

Пажадана адмеціць вышыні месца за кладу сьвідравіны. Таксама пажадана прыкласьці да заяўкі заключэньні гідрагеалёгаў, калі такія ёсьць.

Работы праводзяцца круглы год.

Заяўні накіроўваць: г. Гомель, вул. Леніна, 18, гомельская канторa бурводтрэст.

БЕЛАРУСКІ ГІДРАМЭТЭАРАЛЁГІЧНЫ ІНСТЫТУТ (ГІМЭІН) абвяшчае ПРЫЁМ АСЬПІРАНТАЎ па мэтэаралёгіі па ўхілах: кліматалёгіі, с.-г. мэтэаралёгіі і аэралёгіі (або актынамэтрыі, у залежнасьці ад навуковай кваліфікацыі).

У асьпіранты прымаюцца па кліматалёгіі і аэралёгіі (ці актынамэтрыі) скончыўшыя вышэйшую навучальную гідрамэтэаралёгічную ўстанову або фізыка-матэматычны факультэт унівэрсытэту, таксама скончыўшыя іншыя сумежныя ВНУ і маючыя адведаныя практычны стаж па мэтэаралёгіі; па с.-г. мэтэаралёгіі—скончыўшыя вышэйшую навучальную агранамічную школу па галіне агратэхніки, ня вузкай спэцыяльнасьці.

Тэрмін навучаньня па ўсіх галінах 3 гады.

Узрост прыймаемых у асьпіранты ад 22 да 36 год.

Прыём заяў да 15-га верасьня г. г.

У заяве трэба паказаць выбраную спэцыяльнасьць і да заявы прыкласьці: пасьведчаньне, жыцьцяпіс, засьведчаную арганізацыямі, ня ніжэй раённых, анкету, па ўстаноўленай для асьпірантаў форме, камандыроўку, або згоду ўходу з апошняга месца працы, даведку пра скамчэньне ВНУ або дыплём, водзывы парт. праф. і грамадзкіх арганізацый, даведку аб сацыяльным паходжаньні, копію працоўнага сьпісу, копію вайсковага дакумэнту, даведку аб стане здароўя.

У асьпіранты залічваюцца пасьля здачы калёкаіуму ка матэматыцы, фізыцы, родная мове і грамадзкіх дысцыплінах (палітэканоміі і дыямат) у аб'ёме ВПУ.

Прынятыя ў асьпіранты забясьпечваюцца стыпэндыяй у залежнасьці ад пасьпяховасьці, паводле існуючых для асьпірантаў ставак (ад 175 да 300 руб. у месяц). Кватэрамі будуць забясьпечаны толькі самі асьпіранты, без іх сем'яў.

Заявы з адведанымі дакумэнтамі накіроўваць па адрасе: Менск, Шырокая, 28, ГІМЭІН.

дырэкцыя.

НЕ ЧАКАЙЦ